БИБЛИОТЕКА
БГУ

www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта 20 кастрычніка 2008 года, № 15–16 (1987–1988)

ПАДЗЕЯ

## ВЫХАД У АДКРЫТУЮ ПРАСТОРУ

***Нарэшце адбылося тое, чаго студэнты факультэта журналістыкі, а таксама філасофіі і сацыяльных навук чакалі так доўга і з такой нецярплівасцю, — 16 верасня ў вучэбным корпусе БДУ на Кальварыйскай, 9 адкрылася мультымедыйная бібліятэка, закліканая зрабіць навучальны працэс больш эфектыўным і камфортным.***



*Дырэктар ФБ БДУ Пётр Лапо паказвае магчымасці мультымедыйнай бібліятэкі*

У распараджэнні чытачоў тры залы: перыёдыкі, абанемента вучэбнай, навуковай і мастацкай літаратуры, а таксама чытальня. У зале абанемента да паслуг наведвальнікаў звыш 200 тыс. найменняў кніг. У зале перыёдыкі студэнты і выкладчыкі могуць пазнаёміцца з вялікай колькасцю часопісаў і газет – іх тут каля 70 назваў першых і 58 другіх. А нядаўна тут з'явіўся аддзел кітайскай прэсы, які быў урачыста адкрыты першым сакратаром па адукацыі і культуры пасольства КНР у нашай дзяржаве Бэй Вэнлі.

У новай чытальнай зале рэалізавана канцэпцыя т. зв. бібліятэкі адкрытай прасторы – забяспечаны вольны доступ да інфармацыі на розных носьбітах. Кнігі студэнт зможа выбіраць самастойна, без дапамогі бібліятэкара, што дазваляе значна эканоміць час і знаходзіць іншыя кнігі патрэбнай тэматыкі. Аднак вынесці кнігу, не паведаміўшы бібліятэкару, будзе немагчыма, бо кожная з іх прамаркіравана, а выхад аснашчаны спецыяльнай рамкай. Акрамя друкаванага фонду, які складаецца з 20 тыс. асобнікаў, студэнты і выкладчыкі змогуць працаваць з паўнатэкставай інфармацыйна-пошукавай базай даных па заканадаўстве Рэспублікі Беларусь "Эталон", дакументамі "КансультантПлюс", базамі даных кампаній "EBSCO", Intergrum, Springer і інш.

Агульная плошча чытальні складае 490 кв. м. Тут 120 пасадачных месцаў, 35 з якіх абсталяваны персанальнымі камп'ютарамі з доступам у інтэрнэт. Да паслуг наведвальнікаў залы таксама і шматфункцыянальны капіравальны апарат.

На адкрыцці мультымедыйнай бібліятэкі выступілі госці і кіраўнікі універсітэта, дырэктар Фундаментальнай бібліятэкі БДУ Пётр Лапо, а таксама дырэктар Інстытута журналістыкі Сяргей Дубовік і дэкан ФФСН Анатоль Рубанаў. Рэктар БДУ Васіль Стражаў адзначыў, што адной з найважнейшых задач новай бібліятэкі з'яўляецца пашырэнне камп'ютарызацыі навучальнага працэсу, а таксама змяненне адносінаў выкладчыкаў да выкарыстання ў ім электронных рэсурсаў.

Мультымедыйная бібліятэка будзе працаваць з 9.00 да 19.00 у будныя дні, у суботу з 10.00 да 17.00.

Канцэпцыя і тэхналогіі адкрытай для чытача прасторы даўно і шырока ўкараняюцца ў бібліятэках адукацыйных устаноў. Стратэгія развіцця Фундаментальнай бібліятэкі БДУ прадугледжвае яе паступовую рэалізацыю ва ўсіх чытальных залах і на абанементах бібліятэкі.

**Анастасія ШМІГЕЛЬСКАЯ**
**Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА**

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

**ВЫНІКІ РАБОТЫ БДУ Ў 2007–2008 НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДЗЕ І ЗАДАЧЫ НА 2008–2009 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД**
З даклада рэктара БДУ прафесара Васіля Стражава
**Стар. 2–3**

**"МЫ ВЕДАЕМ ЦАНУ РАСЛІНАМ"**
Пра дзейнасць РУП "Шчомысліца" распавядае дырэктар прадпрыемства Сяргей Чайкун
**Стар. 5**

**ТЭАТРАЛЬНЫ КУФАР–2008**
БДУ зладзіў у 5-ы раз папулярны фестываль творчасці
**Стар. 8**

## З днём нараджэння, БДУ!

**Урачыстае пашыранае пасяджэнне Вучонага савета, прысвечанае 87-й гадавіне з дня заснавання Белдзяржуніверсітэта, адбудзецца 27 кастрычніка. Запрошаны кіраўнікі факультэтаў, студэнты і аспіранты. А 30 кастрычніка ў футбольным манежы будзе зладжана вялікая святочная праграма.**

ДАСЯГНЕННІ

## МАКСІМУМ БДУ

***Восем залатых і чатыры срэбраныя медалі атрымала прадукцыя БДУ на конкурсе "Найлепшы інавацыйны праект і найлепшая навукова-тэхнічная распрацоўка года", якія прайшоў 22—25 верасня ў Санкт-Пецярбургу ў рамках XIV Міжнароднай выставы-кангрэса "Высокія тэхналогіі. Інавацыі. Інвестыцыі". Прычым адна з "залатых" распрацовак — высокаэфектыўны месбаўэраўскі спектрометр MS-2000 — ганаравана яшчэ і спецыяльным прызам як пераможца ў намінацыі "Найлепшы інавацыйны праект у галіне вытворчых тэхналогій".***

Усяго БДУ прэзентавала 12 праектаў, створаных на фізічным факультэце, у НДІ фізіка-хімічных праблем, "Канструктарскім бюро спецыяльнай тэхнікі", "Унітэхпраме БДУ", НДІ прыкладных фізічных праблем, і усе яны былі адзначаны высокімі ўзнагародамі.

Акрамя вышэйзгаданага спектрометра, "золата" атрымалі: лекавы сродак "Працэлан" у выглядзе біяраспушчальных сурвэтак і гідрафільнай мазі;



*Супрацоўнікі УІД БДУ з узнагародамі пецярбургскай выставы*

тэхналогія вытворчасці стабілізаванага харчовага льнянога алею; дарожны кантролер; аўтаматызаваная сістэма кіравання дарожным рухам; экспертна-дыягнастычная сістэма для вылучэння сярод насельніцтва груп рэспіраторнай рызыкі, ранняга выяўлення і маніторынгу хранічнай абструктыўнай хваробы лёгкіх на базе спірометра-пульсаксіметра МАС-1; аўтаматызаваныя дазіравальныя ўстаноўкі для нанясення пенапаліурэтанавых кляёў пры вытворчасці сэндвіч-панэляў; заліваўчна-змешвальнае абсталяванне для вытворчасці аўтатрактарных фільтраў любога тыпу з выкарыстаннем пенапаліурэтанавых кампазіцый.

"Срэбрам" узнагароджаны: сродак для дэзінфекцыі "Навісан-1"; адціскны матэрыял альгінатнага тыпу "МААТ-1" для артапедычнай стаматалогіі; тэхналогія дэмантажу абмотак статараў электрарухавікоў гідралітычным спосабам; дарожныя святлафоры.



*Месбаўэраўскі спектрометр MS-2000*

Усе ўзгаданыя распрацоўкі выклікалі цікавасць у прадстаўнікоў многіх замежных фірмаў і арганізацый. З імі былі наладжаны перамовы наконт заключэння дагавораў аб супрацоўніцтве, а таксама кантрактаў на дастаўку прадукцыі.

Дасягненне такога максімальна высокага выніку ў конкурснай праграме абумоўлена двума асноўнымі фактарамі – высокім узроўнем навукоўцаў БДУ і наяўнасцю ў Белдзяржуніверсітэце навукова-інавацыйнай структуры, якая ўключае не толькі лабараторыі на факультэтах і ў даследчых інстытутах, але і вопытныя вытворчасці і высокатэхналагічныя унітарныя прадпрыемствы. Такая структура дазваляе давесці навуковую ідэю да серыйнага выпуску прадукцыі з наяўнасцю эксплуатацыйных і ахоўных дакументаў. Гэты станоўчы момант неаднаразова быў адзначаны экспертамі конкурсу і кіраўніцтвам шэрага дэлегацый расійскіх ВНУ.

Для параўнання: іншыя ВНУ рэспублікі прэзентавалі 22 праекты, з якіх 10 атрымалі залатыя медалі, 8 – срэбраныя і 4 адзначаны дыпломамі.

**Таццяна АПАНАСЕВІЧ,**
**заг. сектара інфармацыйных тэхналогій упраўлення інавацыйнай дзейнасці БДУ**

# ВЫНІКІ РАБОТЫ БДУ Ў 2007/2008 НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДЗЕ

## З выступлення рэктара Беларускага дзяржаўнага універсітэта прафесара Васіля СТРАЖАВА на пашыраным пасяджэнні Вучонага савета БДУ 29 верасня 2008 года

(1) Звесткі аб кантынгенце студэнтаў БДУ




(2) Звесткі пра колькасць замежных грамадзян-навучэнцаў БДУ з 2003 года да цяперашняга часу




Сёлета мы прынялі столькі ж студэнтаў, як і ў мінулым годзе, і ў выніку наш універсітэт дасягнуў асаблівай лічбы – 25 тыс. студэнтаў *(слайд 1)*. На дзённае аддзяленне паступіў 4331 чалавек (з іх 1929 – на бюджэтную форму і 2402 – на платную) і на завочнае – 1479 чалавек (338 – на бюджэтную форму і 1141 – на платную). Гэтую тэндэнцыю павелічэння колькасці студэнтаў можна растлумачыць наступным чынам: БДУ з'яўляецца ВНУ элітнай, а не элітарнай. Іншымі словамі, мы даем магчымасць навучацца ўсім тым, хто добра падрыхтаваны, і таму пашыраем набор. Калі глядзець на "якасць" студэнтаў, якіх мы прымаем, на ўзровень іх атэстатаў і колькасць набраных балаў, то можна канстатаваць: да нас паступаюць найлепшыя абітурыенты з усёй краіны. Але разам з тым павелічэнне прыёму на I курс і ў цэлым павелічэнне колькасці студэнтаў БДУ азначае, што ва універсітэце трэба актыўна развіваць самастойную работу, павялічваць вучэбны кантроль. Асабліва гэта важна рабіць на завочнай форме навучання, на што ёсць адпаведнае рашэнне Вучонага савета.

Звяртае ўвагу прыкметнае павелічэнне замежных навучэнцаў *(слайд 2)*. Ва ўсіх краінах свету іх колькасць з'яўляецца адным з важных індыкатараў якасці адукацыі і ўзроўню падрыхтоўкі. У ВНУ, якія не адпавядаюць гэтым параметрам, замежнікі не едуць. Большая частка нашых замежных студэнтаў – грамадзяне КНР, і найважнейшае значэнне для іх паспяховай вучобы ў БДУ мае якасць падрыхтоўкі па рускай мове. Адсюль вынікаюць асобыя задачы перад нашым Інстытутам бесперапыннай адукацыі і агульнауніверсітэцкай кафедрай рускай мовы, якая курыруе замежных студэнтаў у працэсе іх навучання.

Узнікае, адпаведна, пытанне, ці дастатковая ў нас матэрыяльна-тэхнічная база для навучання? Колькасць студэнтаў, якіх можа прыняць ВНУ, не з'яўляецца адвольнай. Яна абумоўлена ліцэнзіяй, залежнай ад колькасці вучэбных плошчаў. БДУ мае ліцэнзію на навучанне 22,5 тыс. студэнтаў на дзённай форме навучання, у той час як у нас на гэты момант іх налічваецца 18711.

Сёлета ў нас святкаваліся два наваселлі. Гэта найперш увядзенне вучэбнага корпуса гуманітарных факультэтаў на Кальварыйскай, 9, дзе размяшчаюцца Інстытут журналістыкі і ФФСН (агульная плошча – больш за 25 тыс. кв. м). Таксама пачаў дзейнічаць новы вучэбны корпус ДзіКСТ на Абойнай, 7, агульнай плошчай каля 4 тыс. кв. м. Працягваецца ўзвядзенне вучэбнага будынка на Прывакзальнай плошчы, які плануецца адкрыць 1 верасня 2010 г. Акрамя таго, завершаны рамонт стадыёна спарткомлексу. У наступным годзе з ліпеня пачынаецца рэканструкцыя галоўнага корпуса, якая разлічана на 3 гады. Яна закране частку будынка ад фізфака да дэканата мехмата. Затым мяркуецца рэканструяваць левае крыло галоўнага корпуса, а пасля – астатнюю частку, дзе размесціцца ўжо толькі бібліятэка. Плануецца з цягам часу ўзвесці сацыяльна-культурны цэнтр ва ўнутраным дворыку універсітэта і спартыўнае збудаванне ў Шчомысліцы.

Сёлета з-за вялікай колькасці першакурснікаў абвастрылася праблема засялення ў інтэрнаты. На гэта ёсць некалькі прычын. Па-першае, мяняюцца прапорцыі паміж мінчанамі і іншагароднімі. Калі гадоў 7–8 таму ў БДУ паступала 60 % мінчан і 40 % іншагародніх, то зараз наадварот. Гэта аб'ектыўна ўскладняе сітуацыю. А паколькі мы былі вымушаны закрыць на капітальны рамонт інтэрнат № 7 на 1200 месцаў, то забяспечанасць жыллём значна знізілася. Сёння яна складае 55 % ад колькасці ўсіх ахвотных. Але сітуацыя хутка зменіцца да лепшага, бо на пачатак 2010/2011 навуч. г. ужо будзе працаваць згаданая "сямёрка". Пачалося будаўніцтва новага інтэрната на 1020 месцаў па прасп. Дзяржынскага (увод к 1 верасня 2009 г.) побач са Студэнцкай вёскай. І, акрамя таго, у ёй будзе таксама пабудаваны яшчэ адзін аналагічны інтэрнат.

Ужо ў 2010 г. мы выйдзем на 75–80 % забяспечанасці ўсіх ахвотных. А пасля ўводу інтэрната ў Студвёсцы працэнт забяспечанасці жыллём складзе больш за 90 %. Апроч таго, па даручэнні прэзідэнта Мінгарвыканкам прыняў рашэнне аб будаўніцтве ў будучым годзе жылога дома для выкладчыкаў БДУ. А на месцы будынка "Белхім", што ва ўнутраным дворыку, – вучэбнага корпуса для аспірантаў і маладых выкладчыкаў. Адным словам, у нас вельмі добрыя перспектывы для развіцця універсітэта.

(3) Абсалютная паспяховасць студэнтаў дзённага навучання ў вясновую экзаменацыйную сесію ў працэнтах *(агульная)*




(4) Абсалютная паспяховасць студэнтаў 1 і 4 курсаў дзённай формы навучання ў 2007/2008 навуч. г.

| Зімовая сесія | | | Вясновая сесія | |
|---|---|---|---|---|
| 1 курс | 4 курс | | 1 курс | 4 курс |
| 90,2 | 92,6 | Бюджэтнікі | 90,6 | 93,8 |
| 63,7 | 79,6 | Платнікі | 64,9 | 85,4 |
| 96,3 | 89,5 | Медалісты | 88,2 | 96,6 |
| 84,3 | 91,2 | Ліцэісты | 87,6 | 89,4 |
| 95,9 | 96,1 | Удзельнікі алімпіяд | 97,6 | 94,1 |

Гаворачы пра паспяховасць студэнтаў *(слайды 3,4)*, можна заўважыць узнікненне цікавага феномена. Калі раней студэнты прыродазнаўчых спецыяльнасцяў заўсёды паказвалі трохі горшыя вынікі, то за апошнія тры гады сітуацыя змянілася. І гэта, на першы погляд, дзіўная сітуацыя тлумачыцца тым, што ў асноўным платнае навучанне пашыранае на гуманітарных спецыяльнасцях. А ў платнікаў узровень падрыхтоўкі ўсё ж крыху горшы. Гэтым і тлумачыцца пэўнае зніжэнне абсалютнай паспяховасці (вынікі першай здачы экзаменаў).

Вельмі цікавая статыстыка па студэнтах II і IV курсаў. Першае, што кідаецца ў вочы, – удзельнікі алімпіяд на вышыні на ўсіх сесіях. У той жа час паспяховасць медалістаў і ліцэістаў пасля першага курса значна падае і становіцца ніжэйшай за сярэднія паказальнікі студэнтаў бюджэтнай формы навучання. Гэта, вядома, не азначае, што нашы медалісты і ліцэісты "ліпавыя". Але справа ў тым, што яны пераацэньваюць свае здольнасці. Маючы бліскучую адукацыю, яны ўпэўненыя, што гэтаксама лёгка і нязмушана будуць вучыцца і далей. Але універсітэт – гэта вышэйшая ступень адукацыі. У яго зусім іншыя патрабаванні, мінулыя заслугі тут не ўлічваюцца. Неабходна паказваць веды заўсёды, і для многіх гэта нечаканасць. Нашым выкладчыкам і дэканатам варта звяртаць на адораных студэнтаў асаблівую ўвагу, ствараць для іх такія ўмовы, каб яны маглі праявіць свае найлепшыя якасці.

Размеркаванне выпускнікоў з году ў год паляпшаецца. Практычна ўсе маладыя спецыялісты працаўладкоўваюцца. У той час відавочная неабходнасць у больш фундаментальным падыходзе да практычнай падрыхтоўкі студэнтаў. Трэба, каб студэнты як мага раней пачыналі цікавіцца, дзе яны маглі б прыкласці свае сілы. І ў гэтым ім неабходна дапамагаць.

(5) Адказы на пытанні анкеты студэнтаў 2–4 курсаў 2005–2008 гг.

**Ці займаецеся Вы навукова-даследчыцкай працай, акрамя напісання курсавых і дыпломных работ?**

| | 2005 | 2006 | 2007 | 2008 |
|---|---|---|---|---|
| Так, займаюся сістэматычна | 5.7% | 5.7% | 4.7% | 4.2% |
| Так, займаюся перыядычна | 16.2% | 14.3% | 13.7% | 15.0% |
| Не займаюся, але хацеў бы | 54.1% | 53.3% | 52.3% | 51.7% |
| Не займаюся і не маю такога жадання | 23.6% | 26.3% | 29.3% | 29.1% |
| Няма адказу | .5% | .3% | | |

(6) Адказы на пытанні анкеты выкладчыкаў 2005/2007–2008 гг.

**Ці займаецеся Вы, акрамя выкладчыцкай дзейнасці, навукова-даследчай працай?**

| | 2005 | 2007 | 2008 |
|---|---|---|---|
| Так, сістэматычна займаюся навукова-даследчай працай | 63.9% | 51.7% | 59.8% |
| Так, займаюся перыядычна | 34.3% | 41.3% | 32.8% |
| Не займаюся, бо не хапае часу | 1.4% | 5.8% | 3.9% |
| Не займаюся і не маю такога жадання | | .8% | 1.9% |
| Няма адказу | .5% | .4% | 1.5% |

(7) Навуковыя публікацыі



| Год | 2003 | 2004 | 2005 | 2006 | 2007 |
|---|---|---|---|---|---|
| Артыкулы ў часопісах | 4032 | 4705 | 4184 | 4318 | 5647 |
| У тым ліку за мяжой (не ў СНД) | 604 | 660 | 735 | 559 | 744 |
| Тэзісы на навуковых канферэнцыях | 2516 | 2654 | 2423 | 2333 | 2486 |
| Усяго навуковых публікацый | 6548 | 7359 | 6607 | 6651 | 8133 |

Навукова-даследчая работа студэнтаў грае важную ролю ў павышэнні якасці падрыхтоўкі маладых спецыялістаў. Згодна з праведзеным штогадовым апытаннем *(слайд 5)* відаць, што больш за палову студэнтаў усё яшчэ хацелі б займацца гэтай справай, але не займаюцца. Гэта значыць, што мы не выкарыстоўваем існы патэнцыял. Трэба больш актыўна развіваць навукова-даследчыя гурткі пры кафедрах. На многіх з іх яны існуюць толькі на паперы і не дзейнічаюць. А далучэнне студэнтаў да навуковай работы з'яўляецца вельмі важным паказальнікам для любой ВНУ, якая прэтэндуе на вядучыя пазіцыі. Нездарма сёння ў свеце з'явіўся панятак навукова-даследчага універсітэта. Не сакрэт, што калі літаральна ісці ўслед за Балонскай праграмай рэфармавання вышэйшай школы, то ў выніку ўсталюецца ўсеагульная ўраўнілаўка. Таму ў Заходняй Еўропе пачалі выкарыстоўваць для вылучэння вядучых навучальных устаноў такі панятак, як "навукова-даследчы універсітэт", у Расіі – "федэральны універсітэт" (такіх у РФ зараз менш, чым 20 з прыкладна 900 ВНУ). У такога кшталту ВНУ, апроч сур'ёзнай арганізацыі навукова-даследчай дзейнасці, адной з асноўных прыкмет з'яўляецца актыўны ўдзел у ёй і выкладчыкаў, і студэнтаў.

(8) Адказы на пытанні анкеты студэнтаў 2–4 курсаў 2005–2008 гг.

**Якімі крыніцамі інфармацыі Вы найчасцей карыстаецеся пры падрыхтоўцы заняткаў?**

| | 2005 | 2006 | 2007 | 2008 |
|---|---|---|---|---|
| Падручнікі, вучэбна-метадычныя дапаможнікі | 71.0% | 68.3% | 67.3% | 71.3% |
| Даведнікі, слоўнікі, энцыклапедыі | 26.8% | 26.6% | 23.9% | 24.3% |
| Канспекты лекцый выкладчыкаў | 73.6% | 74.0% | 73.4% | 69.1% |
| Рэкамендаваную выкладчыкам літаратуру | 43.7% | 39.4% | 42.2% | 42.8% |
| Дадатковую навуковую літаратуру | 17.1% | 20.6% | 20.7% | 18.0% |
| Інтэрнэт-інфармацыю | 43.8% | 51.5% | 61.0% | 64.7% |
| Іншае | 1.7% | .4% | .9% | .4% |
| Няма адказу | .6% | .4% | .6% | .3% |

(9) Адказы на пытанні анкеты студэнтаў 2–4 курсаў 2005–2008 гг.

**Якіх ведаў і навыкаў, важных для будучай працы, Вам не стае?**

| | 2005 | 2006 | 2007 | 2008 |
|---|---|---|---|---|
| Веданне замежных моваў | 60.1% | 59.4% | 65.6% | 59.3% |
| Арганізатарскіх навыкаў | 33.6% | 34.7% | 36.7% | 38.2% |
| Прафесійных ведаў | 47.4% | 49.3% | 48.5% | 48.7% |
| Камп'ютарнай пісьменнасці | 35.0% | 33.9% | 31.3% | 28.1% |
| Самастойнасці мыслення | 16.4% | 16.7% | 15.5% | 18.4% |

# І ЗАДАЧЫ НА 2008/2009 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД

(10) Адказы на пытанні анкеты 2005–2008 гг.

**Як Вы лічыце, ці ўласцівы навучальнаму працэсу на Вашым факультэце гнуткасць, мабільнасць у выбары метадаў выкладання і саміх выкладчыкаў, у абнаўленні зместу дысцыплін, вучэбных планаў і адукацыйных тэхналогій?**

| студэнты | | | | | выкладчыкі | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2005 | 2006 | 2007 | 2008 | | 2005 | 2006 | 2008 |
| 12.9% | 13.3% | 15.9% | 15.2% | Так | 42.1% | 37.1% | 37.1% |
| 46.5% | 45.6% | 44.2% | 44.6% | Хутчэй, што так | 48.1% | 48.6% | 51.4% |
| 21.9% | 24.4% | 23.6% | 24.0% | Хутчэй, што не | 6.9% | 8.1% | 9.3% |
| 7.8% | 7.2% | 7.7% | 8.8% | Не | | 1.9% | .4% |
| 10.9% | 9.4% | 8.6% | 7.4% | Цяжка адказаць | 2.8% | 4.2% | 1.9% |

(11) Адказы на пытанні анкеты 2005–2008 гг.

**Як бы Вы вызначылі ўзровень навыкаў самастойнай працы студэнтаў?**

| студэнты | | | | | выкладчыкі | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2005 | 2006 | 2007 | 2008 | | 2005 | 2006 | 2008 |
| 7.6% | 11.7% | 7.7% | 9.2% | Высокі | | 1.5% | 1.9% |
| 28.7% | 29.9% | 34.6% | 34.5% | Вышэй за сярэдні | 13.4% | 10.8% | 13.1% |
| 49.8% | 48.8% | 46.7% | 47.3% | Сярэдні | 56.0% | 52.1% | 56.0% |
| 7.0% | 4.9% | 5.0% | 4.1% | Ніжэй за сярэдні | 21.8% | 28.2% | 18.5% |
| 1.2% | .8% | 1.9% | 1.0% | Нізкі | 6.9% | 6.6% | 8.9% |
| 5.7% | 3.8% | 4.2% | 3.9% | Цяжка адказаць | 1.9% | .8% | 1.5% |

Вынікі апытанняў сведчаць пра глыбінныя змены ў падрыхтоўцы студэнтаў *(слайд 8)*. Калі раней асноўнай крыніцай інфармацыі для студэнтаў былі канспекты лекцый, то зараз на першае месца выйшлі падручнікі і вучэбна-метадычныя дапаможнікі і рэзка ўзрасло значэнне інтэрнэт-інфармацыі. Сёння інфармацыйныя тэхналогіі для нашай студэнцкай моладзі становяцца такімі ж звыклымі паняткамі, як і ў мой час з'яўленне і выкарыстанне шарыкавай ручкі. У арганізацыі самастойнай працы мы, як вядома, надаем тэхналогіям вялікую ўвагу. Вядзецца значная праца па стварэнні электронных вучэбных дапаможнікаў, сістэмы тэсціравання. Адначасова існуе неабходнасць у карэкціроўцы плана развіцця універсітэта, прынятага ў 2004 г. За мінулыя гады мы, безумоўна, дасягнулі пэўных поспехаў у выкананні адпаведных праграм, але зараз таксама відавочна, што можна ставіць больш высокія задачы і мэтазгодна распрацаваць новую праграму, зыходзячы з сярэднетэрміновай перспектывы да 2015 г.

Калі гаварыць пра вучэбную работу *(слайд 9)*, то, як і раней, студэнты скардзяцца на недахопы ведання замежных моў, недастатковасць прафесійнай падрыхтоўкі і камп'ютарнай пісьменнасці. Гэтыя пытанні раней абмяркоўваліся, і прыняты пэўныя рашэнні, якія ўжо выконваюцца. Але што да ведання замежных моў, то ў многім гэта залежыць ад саміх студэнтаў. Мала мець жаданне, трэба імкнуцца яго ажыццявіць праз канкрэтныя дзеянні. Прыемна марыць стаць паліглотам, але, калі для гэтага не прыкладаеш дастатковых намаганняў, ім, натуральна, не станеш. Тое ж можна сказаць і наконт камп'ютарнай пісьменнасці, хоць заўважана, што колькасць тых, хто скардзіцца на камп'ютарную непісьменнасць, кожны год зніжаецца. З аднаго боку, гэта з'яўляецца сведчаннем той работы, якая праводзіцца ва універсітэце, а з другога боку, тлумачыцца ростам матэрыяльнага дабрабыту сем'яў, у большасці з якіх маюцца персанальныя камп'ютары, і паляпшэннем камп'ютарнай базы агульнаадукацыйнай школы. Што да наракання на недахоп прафесійных ведаў: трэба накіроўваць прэтэнзіі, у першую чаргу, да выпускаючых кафедраў. І гэта звязана з недастатковай практычнай падрыхтоўкай і недастатковай увязкай тэарэтычных ведаў, якія даюцца студэнту, з тымі ведамі, якія патрабуюцца ў іх жыцці і іх прафесіі. Непакоіць факт росту колькасці тых, хто скардзіцца на недахоп самастойнасці мыслення. Рашэнне гэтага пытання трэба шукаць і ў развіцці студэнцкага самакіравання, і актыўнага ўключэння студэнтаў у грамадскую працу, бо менавіта там, як нідзе, можна найлепш авалодаць навыкамі арганізатарскай работы і самастойнага мыслення. Пэўная задача стаіць перад студэнцкімі арганізацыямі, найперш – Студсаюзам, БРСМ, Студгарадком.

Заўважаецца таксама відавочная раскіданасць меркаванняў сярод выкладчыкаў і студэнтаў пры характарыстыцы ў апошніх навыкаў самастойнай працы *(слайд 11)*, пры ацэнцы мадэрнізацыі вучэбнага працэсу на факультэце *(слайд 10)*. Асабліва гэта відаць пры выстаўленні высокіх і добрых адзнак. Я лічу, што ў абодвух выпадках погляды выкладчыкаў больш аб'ектыўныя. У стрыманай ацэнцы ўзроўню самастойнай працы студэнтаў яны, у першую чаргу, зыходзяць з іх канкрэтных паказальнікаў, а студэнты, найхутчэй, ацэньваюць сябе па сваіх унутраных адчуваннях. Але такая ацэнка часцяком не супадае з рэальнасцю. Асабліва гэта праяўляецца на іспытах.

Студэнтам II–VI курсаў складана таксама даць аб'ектыўную ацэнку вучэбнай сітуацыі, паколькі яны знаходзяцца ўжо ў яе сённяшнім стане і не могуць параўноўваць з тым, як гэта выглядала пяць гадоў таму. Таму іх погляды могуць лічыцца за карысны арыенцір для кіраўніцтва і саміх выкладчыкаў. У гэтай сувязі яшчэ раз падкрэсліваю, што на факультэтах выключна важна падтрымліваць работу студэнцкіх саветаў па кантролі за якасцю адукацыі. Гэта найважнейшы элемент самадзейнасці студэнтаў, найважнейшы элемент арганізацыі вучэбнага працэсу і найважнейшы элемент пад'ёму ўзроўню адукацыі і дасягнення новай якасці.

(12) Сярэдняя нагрузка выкладчыкаў БДУ




(13) Адказы на пытанні анкеты выкладчыкаў 2005/2007–2008 гг.

**Ці задаволены Вы адносінамі:**

| | | 2005 | 2007 | 2008 |
|---|---|---|---|---|
| З кіраўніцтвам | Цалкам задаволены | 63.9% | 61.4% | 62.2% |
| | Хутчэй, што задаволены | 31.5% | 34.0% | 32.8% |
| | Хутчэй, што не задаволены | 2.8% | 3.5% | 3.9% |
| | Цалкам не задаволены | .9% | .4% | .4% |
| | Цяжка адказаць | .9% | .8% | .8% |
| З калегамі | Цалкам задаволены | 69.9% | 68.0% | 66.0% |
| | Хутчэй, што задаволены | 26.9% | 29.3% | 32.0% |
| | Хутчэй, што не задаволены | 1.9% | 1.5% | .4% |
| | Цалкам не задаволены | 1.4% | 1.2% | 1.5% |
| | Цяжка адказаць | | | |

Сярэдняя нагрузка выкладчыкаў нязначна ўзрасла ў параўнанні з мінулымі гадамі, але ў той жа час знаходзіцца на абсалютна прымальным узроўні *(слайд 12)*. Аналіз сведчыць, што непасрэдна аўдыторная нагрузка (а гэта лекцыі, практычныя заняткі, семінары, лабараторныя працы) складала летась толькі 50,8 % (у сярэднім 375 гадзін). Магу запэўніць, што ў астатніх ВНУ яна як мінімум у 1,5 разы вышэйшая, а то і больш. Таму ёсць усе падставы гаварыць, што для працы выкладчыкаў універсітэта створаны нармальныя, нават ашчадныя ўмовы. Пацвярджэннем служыць адпаведнае апытанне выкладчыкаў за апошнія 3 гады аб стасунках, якія склаліся з кіраўніцтвам і калегамі *(слайд 13)*. Вельмі прыемна, што адказы адназначна сведчаць пра добры маральна-псіхалагічны клімат ва універсітэцкім калектыве. Сёння якія-небудзь значныя канфлікты ў БДУ практычна адсутнічаюць.

(14) Звесткі аб асноўных работніках прафесарска-выкладчыцкага складу БДУ, якія маюць вучоныя ступені і званні, у дынаміцы з 2001 г.

| Год | Маюць вучоную ступень: усяго | у тым ліку д/н | у тым ліку к/н |
|---|---|---|---|
| 2001 | 981 | 178 | 803 |
| 2002 | 1022 | 195 | 827 |
| 2003 | 1040 | 194 | 846 |
| 2004 | 1078 | 196 | 882 |
| 2005 | 1106 | 200 | 906 |
| 2006 | 1114 | 203 | 911 |
| 2007 | 1115 | 205 | 910 |
| 2008 | 1126 | 203 | 923 |

| Год | Маюць вучонае званне: Усяго | у тым ліку прафесар | у тым ліку дацэнт |
|---|---|---|---|
| 2001 | 722 | 139 | 583 |
| 2002 | 744 | 153 | 591 |
| 2003 | 747 | 148 | 599 |
| 2004 | 768 | 152 | 616 |
| 2005 | 810 | 160 | 650 |
| 2006 | 838 | 165 | 673 |
| 2007 | 858 | 169 | 689 |
| 2008 | 910 | 176 | 734 |




(15) Працаўладкаванне выпускнікоў аспірантуры на выкладчыцкіх пасадах у БДУ




**За 2003–2007 гг. на выкладчыцкія пасады ў БДУ працаўладкавана 163 выпускнікі аспірантуры.**

Павышаецца колькасць кандыдатаў і дацэнтаў, а колькасць дактароў навук застаецца нязменнай *(слайд 14)*. На тое ёсць некалькі прычын. Па-першае, жорсткія патрабаванні ВАК, асабліва ў галіне гуманітарных дысцыплін. І, па-другое, адсутнасць дастатковых стымулаў для працы над доктарскай дысертацыяй. Не сакрэт, што гэта – агромністая і цяжкая праца. У гэтай сувязі перад намі паўстае задача стварыць усе неабходныя ўмовы для тых, хто рэальна можа абараніць дысертацыю і атрымаць затым званне прафесара, бо наяўнасць пэўнай катэгорыі з'яўляецца адным з найважнейшых паказальнікаў для любой ВНУ, якая прэтэндуе на вядучыя ролі. Заўважу, на жаль, што працягваецца працэс старэння нашага прафесарска-выкладчыцкага складу. І нягледзячы на тое, што мы павялічваем прыём выпускнікоў аспірантуры на выкладчыцкія пасады *(слайд 15)*, узроставая дынаміка пакуль несуцяшальная. Сярэдні ўзрост ПВС па БДУ зараз складае 48 гадоў. На шчасце, ён пакуль не павялічваецца, але затое адбываецца старэнне прафесарскага складу. Зараз сярэдні ўзрост прафесараў – 64 гады, загадчыкаў кафедраў – 56 гадоў. Абнаўленне ПВС і прыцягненне маладых кадраў як ніколі застаецца надзённай праблемай, і яе мы павінны рашаць разам.

(16) Фінансавыя сродкі, атрыманыя ад навуковай і навукова-тэхнічнай сферы комплексу БДУ




(17) Бюджэтныя асігнаванні па БДУ за перыяд 2001–2008 гг.



(18) Структура пазабюджэтных прыбыткаў БДУ за 2001–2008 гг.




(19) Статыстычныя даныя аб сярэднямесячным заробку за 2003–2008 гг.




Што да фінансавага становішча, то дзяржава аказвае вялікую падтрымку універсітэту, сведчаннем чаму з'яўляюцца звесткі з *слайда 17*. За апошнія пяць гадоў фінансаванне БДУ значна павялічылася. Адначасова заўважна выраслі і пазабюджэтныя прыбыткі універсітэта, асабліва звязаныя з адукацыйнай дзейнасцю *(слайд 18)*. Усё гэта станоўча ўплывае на абнаўленне матэрыяльна-тэхнічнай базы, забеспячэнне прымальнага ўзроўню заработнай платы супрацоўнікаў універсітэта *(слайд 19)*. Сёння ёсць усе перадумовы для таго, каб у найбліжэйшыя гады сярэднямесячны заробак значна павялічыўся.

АКТУАЛЬНА

# РАШЭННЕ ВУЧОНАГА САВЕТА

***Пасля заслухоўвання і абмеркавання даклада рэктара прафесара Васіля Стражава "Вынікі работы Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў 2007/2008 навучальным годзе і задачы на 2008/2009 навучальны год" Вучоны савет адзначае, што калектыў універсітэта ў мінулым годзе працягваў работу па рэалізацыі мерапрыемстваў Праграм развіцця універсітэта (2005-2011 гг.) і Плана перспектыўнага развіцця на 2006-2010 гг.***

У комплексе БДУ, згодна са становішчам на чэрвень 2008 г., працавала 8 424 чалавекі, з якіх 7 448 – на пастаяннай аснове. Разам з сумяшчальнікамі з іншых арганізацый ва універсітэце працуе 409 дактароў навук і 1 636 кандыдатаў навук. Сярэдні ўзрост прафесарска-выкладчыцкага складу налічвае 48 гадоў, загадчыкаў кафедраў – 56 гадоў, прафесараў – 64 гады. Сярэдняя вучэбная нагрузка выкладчыкаў у 2008/2009 навуч. г. складае 750 гадзін і вагаецца ад 537 гадзін на факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі да 895 на факультэце філасофіі і сацыяльных навук.

Усяго ў комплексе БДУ ў 2008/2009 навуч. г. налічваецца 25 943 студэнты, што перавышае аналагічны паказальнік папярэдняга навучальнага года на 1 398 чалавек. На дзённай форме – 18 014 студэнтаў, з іх 9 418 (52,3 %) – на платнай аснове. На завочнай – 7 929 студэнтаў, з іх 4 982 (62,7 %) – на платнай аснове. Абсалютная паспяховасць студэнтаў у вясновую сесію склала 82,5 % на гуманітарных факультэтах і 86 % – на прыродазнаўчых. На VI Міжнароднай студэнцкай алімпіядзе каманда БДУ заваявала 3 залатыя і 1 срэбны медалі.

У аспірантуры і дактарантуры навучаецца 556 аспірантаў (на 108 чалавек меней, чым летась), з іх 125 – па мэтавым накіраванні (на 25 чалавек болей, чым летась), 17 дактарантаў.

У 2007/2008 навуч. г. паспяхова закончаны двухгадовы адукацыйны праект TEMPUS "Уводзіны ў навучальны працэс БДУ крэдытных тэхналогій, адаптаваных да еўрапейскай сістэмы ECTS", які фінансаваўся Еўрапейскай камісіяй. Па ўсіх спецыяльнасцях, замацаваных за УМА па гуманітарнай і прыродазнаўчай адукацыі, распрацаваны новыя адукацыйныя стандарты і тыпавыя вучэбныя планы.

У 2007 г. супрацоўнікі універсітэта абаранілі 54 кандыдацкія і 3 доктарскія дысертацыі, апублікавана 136 манаграфій, 8 падручнікаў, 542 вучэбныя і вучэбна-метадычныя дапаможнікі, 50 зборнікаў навуковых прац, 5 647 навуковых артыкулаў, з іх 744 – у выданнях за межамі СНД.

У 2007 годзе навуковыя ўстановы і падраздзяленні універсітэта выконвалі 1 230 тэм НДВКР, у тым ліку 904 – дзяржбюджэтныя (з іх фінансавался з усіх крыніц бюджэту 780 тэм), 326 – гаспадарча-дагаворных. Выдаткі на выкананне навуковых даследаванняў склалі 40 014,6 млн руб.

*Вучоны савет вырашае:*

1. Калектыву універсітэта ў 2008/2009 навуч. г. скіраваць намаганні на безумоўную рэалізацыю мерапрыемстваў Праграм развіцця універсітэта (2005–2011 гг.) і Плана перспектыўнага развіцця на 2006–2010 гг. У сувязі з завяршэннем некаторых праграм рэктарату стварыць камісію па іх распрацоўцы на наступныя гады для зацвярджэння на Вучоным савеце.

2. Прарэктарам па вучэбнай і навуковай рабоце (У. Клюня, У. Самахвал, У. Панькоў), кіраўнікам вучэбных падраздзяленняў актывізаваць у 2008/2009 навуч. г. працу па заключэнні доўгатэрміновых пагадненняў аб падрыхтоўцы кадраў для адукацыі, навукова-вытворчай, сацыяльнай і іншых сфер; стварэнні вучэбна-навукова-вытворчых цэнтраў, філіялаў кафедраў; увядзенні падрыхтоўкі кадраў па новых спецыяльнасцях у адпаведнасці з запатрабаваннямі рэальнага сектара эканомікі.

3. Фізічнаму факультэту (У. Анішчык) і хімічнаму факультэту (У. Панькоў) распрацаваць і да 1 снежня 2008 г. даць на зацвярджэнне рэктару план мерапрыемстваў па выкананні Дзяржаўнай праграмы падрыхтоўкі кадраў для ядзернай энергетыкі Рэспублікі Беларусь на 2008–2020 гг., зацверджанай Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь 10.09.2008 № 1329.

4. Галоўнаму ўпраўленню вучэбнай і навукова-метадычнай работы (Л. Хухлындзіна) да 1 лістапада 2008 г. распрацаваць праект часовага палажэння аб увядзенні ў навучальны працэс з 2008/2009 навуч. г. сістэмы адукацыйных заліковых адзінак для студэнтаў I курса ўсіх формаў навучання.

5. Галоўнаму ўпраўленню вучэбнай і навукова-метадычнай работы (Л. Хухлындзіна) і Галоўнаму ўпраўленню планавання, бухгалтарскага ўліку і фінансаў (В. Саладуха) да 31 снежня 2008 г. распрацаваць Палажэнне аб парадку ліквідацыі студэнтамі ўсіх формаў навучання акадэмічных запазычанасцяў на платнай аснове.

6. Кіраўніцтву Фундаментальнай бібліятэкі (П. Лапо), Цэнтру інфармацыйных тэхналогій (Ю. Варатніцкі), аддзелу інфармацыйна-тэхналагічнага забеспячэння навучальнага працэсу ГУВНМР (Ю. Пазняк) забяспечыць у 2008/2009 навуч. г. развіццё электроннай бібліятэкі шляхам укаранення сучасных сістэм захавання даных і праграмнага забеспячэння, якія падтрымліваюць сеткавы доступ да рэсурсаў электроннай бібліятэкі структурных падраздзяленняў БДУ і іншых ВНУ краіны. Вучэбным падраздзяленням БДУ размяшчаць завершаныя электронныя адукацыйныя рэсурсы ў электроннай бібліятэцы БДУ з іх дэпаніраваннем у БелІСА.

Рэктарату па выніках работы за навучальны год прэміраваць супрацоўнікаў, якія зрабілі значны ўнёсак у распрацоўку электронных адукацыйных матэрыялаў.

7. Галоўнаму ўпраўленню вучэбнай і навукова-метадычнай работы (Л. Хухлындзіна) у 2008/2009 навуч. г. распрацаваць і ўкараніць агульнауніверсітэцкую сістэму электроннай пашпартызацыі аўдыторнага фонду БДУ ў 2008–2009 гг. сумесна з ЦІТ (Ю. Варатніцкі) – аўтаматызаваную падсістэму "Нагрузка і штаты".

8. З мэтай больш рацыянальнага выкарыстання аўдыторнага фонду Галоўнаму ўпраўленню вучэбнай і навукова-метадычнай работы (Л. Хухлындзіна) з 1 лютага 2009 г. увесці цэнтралізаваную дыспетчарызацыю вучэбных заняткаў у корпусе па вул. Кальварыйскай, 9.

9. Аддзелу матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння (М. Варатніцкі) сумесна з Галоўным упраўленнем планавання, бухгалтарскага ўліку і фінансаў (В. Саладуха), Галоўным упраўленнем вучэбнай і навукова-метадычнай работы (Л. Хухлындзіна), НДЧ-ГУН (Т. Дзік) да 31 снежня распрацаваць Палажэнне аб парадку афармлення заяў на набыццё вучэбна-навучальнага абсталявання і працэдуры яго закупак. НДЧ-ГУН (Т. Дзік) к гэтаму тэрміну распрацаваць Палажэнне аб парадку выкарыстання для навуковых і навучальных мэтаў дарагога абсталявання, якое знаходзіцца ў цэнтрах калектыўнага карыстання і ў структурных падраздзяленнях універсітэта.

10. Дырэкцыі Інстытута журналістыкі (С. Дубовік) пры падтрымцы кіраўніцтва тэлецэнтра БДУ (А. Парфёнаў) арганізаваць, пачынаючы з 01.11.2008, пастаянныя выпускі тэленавін пра жыццё БДУ па ўнутранай тэлекамунікацыйнай сетцы універсітэта.

11. Кіраўніцтву НДЧ-ГУН (Т. Дзік) і ЦІТ (Ю. Варатніцкі) да 1 студзеня 2010 г. стварыць аўтаматызаваную сістэму кантролю за выкананнем навукова-даследчых работ у БДУ.

12. Кіраўніцтву НДЧ-ГУН (Т. Дзік) да 1 студзеня 2009 г. увесці ў дзеянне Палажэнне аб парадку функцыянавання часовых навуковых калектываў у БДУ.

13. Упраўленню па справах культуры (У. Макарэвіч) больш эфектыўна выкарыстоўваць творчы патэнцыял супрацоўнікаў і студэнтаў для культурна-асветніцкай дзейнасці, скіраванай на духоўнае і эстэтычнае выхаванне моладзі, забеспячэнне педагагічнага кантролю над зместам культурных мерапрыемстваў.

14. Упраўленню выхаваўчай работы з моладдзю (П. Скалабан) сумесна з гістарычным факультэтам (С. Ходзін) да 30 кастрычніка распрацаваць пералік знамянальных мясцін, музеяў, пастаянных выстаў для арганізацыі студэнцкіх экскурсій.

15. Цэнтру сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ (Д. Ротман) давесці да зацікаўленых вынікі праведзенага ў верасні 2008 г. сацыялагічнага апытання і сумесна з Упраўленнем выхаваўчай работы з моладдзю, Псіхалагічнай службай, Студэнцкім гарадком распрацаваць пакет дыягнастычных методык па вывучэнні ўплыву адукацыйнага асяроддзя БДУ на фарміраванне і развіццё патрэбаў, інтарэсаў, каштоўнасцяў і жыццёвых установак навучэнцаў.

16. Кіраўнікам вучэбных і навуковых падраздзяленняў універсітэта да 01.11.2008 абмеркаваць гэтае рашэнне на пасяджэннях сваіх вучоных саветаў і прыняць неабходныя захады па яго выкананні.


## АБ'ЯВЫ

## БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: лазернай фізікі і спектраскапіі, радыёфізікі;

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ фізікі, гісторыі новага і найноўшага часу;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі, лазернай фізікі і спектраскапіі, тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, геадэзіі і картаграфіі, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, паліталогіі, радыёфізікі, этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў, гісторыі Расіі, гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў, гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу, неарганічнай хіміі, фізічнай хіміі, радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, геадэзіі і картаграфіі, фізічнага выхавання і спорту, эканамічнай інфарматыкі і матэматычнай эканомікі, фізічнай хіміі;

АСІСТЭНТА КАФЕДРЫ: агульнай фізікі

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў; тэл. 209-54-36.*

## Факультэт павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Інстытута сістэмных даследаванняў праблем моладзі БДУ

*запрашае актыўных, амбіцыйных, накіраваных на поспех студэнтаў БДУ прайсці навучанне па наступных праграмах:*

***"Школа менеджменту і прадпрымальніцтва для моладзі: уласная справа"***

Слухачам даецца унікальны шанец: рэалізаваць сябе ў дзелавой сферы, развіць якасці лідара, сфарміраваць прадпрымальніцкі дух, авалодаць законамі рынкачнай эканомікі, навучыцца фінансавай пісьменнасці, выхаваць у сабе эканамічную і псіхалагічную культуру.

***"Псіхалогія самавызначэння і самарэалізацыі асобы"***

Слухачам даецца унікальны шанец: павысіць уласны ўзровень псіхалагічнай і камунікатыўнай культуры для паспяховага функцыянавання ў прафесійным асяроддзі і грамадстве; выявіць індывідуальна-псіхалагічныя асаблівасці асобы, інтэлектуальныя і творчыя магчымасці, лідарскі патэнцыял з дапамогай псіхалагічнай дыягностыкі; прааналізаваць асаблівасці сваіх паводзін у канфліктных і стрэсавых сітуацыях.

***Школа польскай мовы***

Слухачам даецца унікальны шанец: комплексна вывучыць польскую мову і культуру па сучасных польскіх падручніках з выкарыстаннем аўтэнтычных аўдыё- і відэакурсаў; прайсці моўную стажыроўку ў Рэспубліцы Польшча.

*Толькі для Вас сучасныя метады і тэхналогіі навучання, вядучыя выкладчыкі, прафесійныя трэнеры-кансультанты, паспяховыя бізнэсмэны, спецыялісты-практыкі, эксклюзіўныя аўтарскія курсы.*

*Слухачам, якія паспяхова прайшлі праграмы навучання, выдаецца сертыфікат БДУ.*

**НАШЫ ПРАГРАМЫ – НАДЗЕЙНЫ СТАРТ ДЛЯ БУДУЧАЙ КАР'ЕРЫ!**

*Кантактная інфармацыя:*
*г. Мінск, вул. Ленінградская, 8, каб. 314 (корпус юрыд. ф-та БДУ),*
*Факультэт павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў*
*Інстытута сістэмных даследаванняў праблемаў моладзі БДУ.*
*Тэл./факс 209-55-18; 209-51-52.*
***Запіс да 1 лістапада 2008 г.***
*Форма навучання: вочна-вячэрняя.*

## ДУА "РЭСПУБЛІКАНСКІ ІНСТЫТУТ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ"

**факультэт павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі запрашае на павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку ў кастрычніку – снежні 2008 г.**

**выкладчыкаў і спецыялістаў устаноў адукацыі па наступных кірунках:**

√ Мастацтва псіхолага-педагагічнага ўзаемадзеяння (для выкладчыкаў) 20.10–31.10

√ Прафілактыка асацыяльных з'яў у маладзевым асяроддзі (для кіраўнікоў грамадскіх арганізацый адукацыйных устаноў, куратараў студэнцкіх груп і выхавальнікаў інтэрнатаў) 27.10–31.10, 01.12–05.12

√ Работа педагога з адоранай асобай (для сацыяльных педагогаў, педагогаў-псіхолагаў, выкладчыкаў) 10.11–21.11

√ Метадалогія і методыка дысертацыйнага даследавання (для выкладчыкаў і навуковых супрацоўнікаў ВНУ, НДІ; навуковых кіраўнікоў аспірантаў і магістрантаў) 24.11–05.12

√ Навучальны і выхаваўчы працэс ва ўмовах мадэрнізацыі сістэмы вышэйшай адукацыі (для адміністрацыйна-кіраўнічага персаналу і выкладчыкаў сацыяльна-гуманітарных дысцыплін ВНУ) 08.12–19.12

√ Актуальныя праблемы сучаснай псіхалогіі (для выкладчыкаў) 01.12–12.12

√ Культуралогія 03.11.2008–30.04.2010, 03.11–12.12.

**Калі Вас зацікавіла наша інфармацыя і Вы гатовы ўдзельнічаць у курсах, тэлефануйце: 222-83-03, 200-20-47 для тэрміновага запісу ў групы.**

**Наш адрас: 220007, г. Мінск, вул. Маскоўская, 15, РІВШ, каб. 320; тэл./факс 200-25-51.**

УСТАНОВЫ

## Сяргей ЧАЙКУН:
# "МЫ ВЕДАЕМ ЦАНУ РАСЛІНАМ"

***Рэспубліканскае вучэбна-вопытнае унітарнае прадпрыемства "Шчомысліца" БДУ з'яўляецца добрай базай для біялагічнага, геаграфічнага і гуманітарнага факультэтаў нашага універсітэта, бо здаўна валодае багатай калекцыяй раслін. Яна была сабрана яшчэ ў 1932 г., калі пры асабістым удзеле акадэміка М. Вавілава ў аднайменнай вёсцы арганізавалі Беларускі філіял Усесаюзнага цэнтра даследавання лесу. У дубовым гаі, што ахоўваецца як помнік прыроды, тады былі закладзены лясныя культуры інтрадуцыраваных экзотаў: аксаміт амурскі, дуб чырвоны, арэх маньчжурскі і інш. У той жа час РУП "Шчомысліца" — камерцыйная структура і арыентавана на эканамічны поспех, без якога, дарэчы, нельга ўтрымліваць навуковую базу.***


*Калектыў РУП "Шчомысліца" БДУ (Сяргей Чайкун – у цэнтры)*

### ДЭКАРАТЫЎНЫЯ ДРЭВЫ НОВАГА ПАКАЛЕННЯ

Прадпрыемства перажыло два крызісы – у 90-я гады, калі вялікая тэрыторыя ў 100 га прыйшла ў заняпад, і пяць гадоў таму.

Яшчэ не так даўно здавалася, што такому буйному пастаўшчыку раслiннай прадукцыі для азелянення сталіцы, як РУП "Шчомысліца", ніякія катаклізмы не пагражаюць. Аднак у 2005 г. мінскія ўлады пачалі развіваць уласнае прадпрыемства па азеляненні на базе саўгаса "Броўкі". У выніку закупкі прадукцыі ў Шчомысліцы значна зменшыліся.


*Догляд за саджанцамі*

"Сельскагаспадарчаму прадпрыемству заўсёды цяжка хутка рэагаваць на змены кан'юнктуры, – гаворыць дырэктар РУП Сяргей Чайкун. – Калі пасадзіць куст, то ён вырастае ў найлепшым выпадку праз тры гады, а дрэва становіцца рэалізацыйным ажно праз 8–12 гадоў. Таму наша сённяшняя праца дасць станоўчыя вынікі толькі праз 5–6 гадоў".

Першае, што тут зрабілі для выпраўлення сітуацыі (адначасова з гарадскім азеляненнем: паточным вырошчваннем, напрыклад, 1 тыс. клёнаў або 1 тыс. ліп), – заняліся развядзеннем сартавых дрэваў і прышчэпленых штампавых формаў. Апошнія – гэта дэкаратыўныя дрэвы новага пакалення, вырашчаныя па заходніх тэхналогіях. Іх купляюць паштучна для стварэння невялікіх утульных паркаў і дворыкаў. У РУП "Шчомысліца" пачалі гадаваць свае элітныя дрэвы шляхам чаранкавання закупленых за мяжой сартавых парод (пасеў насеннем у нашых умовах не гарантуе стопрацэнтнай перадачы генетычнай інфармацыі). Менавіта іх формы пачалі прышчэпліваць на 5–10-гадовыя саджанцы звычайных клёнаў або бяроз, якія значна таннейшыя. У выніку за год са звыклых для ўсіх дрэваў удалося зрабіць дэкаратыўныя, ці, як іх яшчэ называюць, штампавыя, дрэвы таго ж чырвонага або плакучага клёну.

Тое самае і з ружамі. За мяжой было закуплена каля 40 новых сартоў. Два гады іх вывучалі і, нарэшце, заняліся размнажэннем. Сёння прадпрыемства мае прыблізна 300 кустоў розных руж, якія з'яўляюцца свайго роду вытворчай базай. І ў наступным годзе тут змогуць атрымаць на продаж ужо каля 2 тыс. кустоў.

РУП "Шчомысліца" збіраецца заняцца яшчэ і вырошчваннем новых сартоў бэзу – вельмі перспектыўнага апошнім часам куста. Тэхналогія яго развядзення таксама прадугледжвае чаранкаванне. З чаранкамі бэзу абяцаў дапамагчы Батанічны сад. Дарэчы, праект з ружамі таксама рэалізоўвалі сумесна. Дзве арганізацыі, адна з якіх валодае добрай навуковай базай, а другая – землямі для камерцыйнай вытворчасці, знайшлі адна адну і вельмі ўдала супрацоўнічаюць.

Такім чынам РУП "Шчомысліца" змагло значна пашырыць асартымент раслін. Тут займаюцца развядзеннем каля 20 відаў дрэваў і 40 відаў кустоў для жывых агароджаў, афармлення ўчасткаў, альпійскіх горак, лужкоў, навакольных тэрыторый.

Вырошчваюць і аднагадовыя кветкі: тагеціс, агератум, петунію, калеус, вярбену, бальзамін і інш. Яны адрозніваюцца ўстойлівасцю да капрызнага надвор'я і доўга захоўваюць дэкаратыўны эфект. Нядаўна пачалі вырошчваць шматгадовыя дэкаратыўныя травяністыя расліны, сярод якіх прымула, бадан, рута, званочак, седумы і інш.

Да ўсяго, кожную вясну пітомнік актыўна рэалізоўвае расаду гародніны, якая карыстаецца вялікім попытам у дачнікаў.

### ПЕРАВАГІ Ў ЖОРСТКАЙ КАНКУРЭНЦЫІ

Каб прадэманстраваць кліентам свае магчымасці, работнікі РУП пераўтварылі ўваход на галоўную сядзібу ў пейзажную выставу з найлепшымі ўзорамі ландшафтнага дызайну. Цяпер пакупнікі змогуць пераканацца, што ім тут прапануюць многія з тых рэдкіх раслін, па якія прыйшлося б ехаць на край свету. Прадукцыю РУП набываюць пераважна невялікія ЖРЭУ, ЖЭСы, будаўнічыя арганізацыі, прыватнікі, а гэта людзі дасведчаныя ў модзе на азеляненне, таму прыходзіцца і самім пастаянна знаходзіцца на плыву: папаўняць веды аб новых відах раслін з дапамогай літаратуры, наведваць шматлікія выставы, праводзіць уласныя навуковыя даследаванні.

Сёння ландшафтнае азеляненне – вельмі дарагая справа. Прыватныя кампаніі, якіх нямала развялося ў Мінску, прапануюць 1 кв. м газона за 5–7 долараў, а 1 кв. м альпійскай горкі каштуе да 1 тыс. долараў. Прыватнікі працуюць, як правіла, на імпартнай сыравіне. Гэта значыць, што рэдкія расліны прывозяцца для спажыўца з Галандыі, Германіі або Польшчы. Яны распрацуюць дызайн для вашага ўчастка, пасадзяць прывезеное дрэва, а калі трэба, нават сцяжынкі пракладуць або зладзяць невялічкія сажалкі...

Тым не менш, РУП "Шчомысліца" перад сваімі канкурэнтамі можа пахваліцца адной, але важкай перавагай: яно азеляняе раслінамі, вырашчанымі на сваёй сядзібе, карнявая сістэма якіх прыстасавана да кліматычных умоў нашай краіны. Адсюль лепшая якасць прадукцыі: дрэва або куст, высаджаны нашымі аграномамі, хутчэй прыстасуецца на новым месцы і не загіне. У "Шчомысліцы" гарантуюць вынік, прычым па значна меншым кошце.

Ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі РУП "Шчомысліца" пастаянна пашырае спектр сваіх паслуг. Ужо другі год, напрыклад, яно азеляняе СП ЗАТ "Мілавіца". Гэта значыць, аграном-дызайнер сам выязджае на аб'ект, робіць аналізы глебы, эскізныя праекты, затым да работы падключаюць уласную тэхніку. Расліны таксама высаджваюць сваёй брыгадай. Ёсць заказы нават ад навучальных устаноў. Недзе два гады таму азелянілі сярэднюю школу № 51 г. Мінска, якая потым заняла першае месца ў конкурсе. У "Шчомысліцы" можна замовіць драўляныя альтанкі, лаўкі, дэкаратыўныя агароджы (ёсць свая піларама). Аднак пакуль тут не могуць прапанаваць паслугі па стварэнні тых жа сцяжынак або вадаёмаў, а таксама некаторыя іншыя рэчы. Для гэтага патрэбна новая тэхніка і дадатковая працоўная сіла. За апошнія два гады ўдалося на заробленыя грошы набыць два трактары "Беларусь" для апрацоўкі глебы і аўтамабіль "Газель" для дастаўкі сваёй прадукцыі да спажыўца. Аднак, колькі б тэхнікі ні выкарыстоўвалася, сельская гаспадарка ўсё роўна застаецца галіной прымянення цяжкай ручной працы. І ў РУП "Шчомысліца" пастаянна патрабуюцца новыя работнікі (зараз там працуе 27 чалавек). Таму летам тут рады дапамозе студэнцкіх атрадаў з універсітэта і школьнікаў, праца якіх аплочваецца на належным узроўні.

Як бы там ні было, у Шчомысліцы здолелі павярнуць сітуацыю на сваю карысць. І на сёння гэта прыбытковае прадпрыемства з устойлівай рэнтабельнасцю. Аб'ём вытворчасці за мінулы год вырас удвая. Нягледзячы на тое, што шмат сродкаў давялося ўкласці ў саму вытворчасць, рэнтабельнасць трымаецца на ўзроўні 10–15 %. Тут у год вырошчваюць 500–600 адзінак раслiннай прадукцыі, што не на шмат меней, чым у тым жа саўгасе "Броўкі".

На думку дырэктара РУП "Шчомысліца" Сяргея Чайкуна, канкурэнты толькі падштурхоўваюць да новых дасягненняў і заўтрашняга дня баяцца не трэба. "Работы ўсім хопіць", – гаворыць ён. У краіне, якая хутка будуецца і адчувае вялікую патрэбу ў азеляненні, такія прадпрыемствы заўсёды знойдуць попыт на сваю прадукцыю.

**Ганна ЛАГУН**
**Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА**

ПРЭЗЕНТАЦЫІ

# У ГАРМОНІІ З ПРЫРОДАЙ



*Леанід Гайдукевіч дэманструе манаграфію па экатурызме*

***2 кастрычніка на кафедры міжнароднага турызму факультэта міжнародных адносін адбылася прэзентацыя манаграфіі "Стратэгія ўстойлівага развіцця экалагічнага турызму ў Беларусі", якая выйшла ў выдавецкім цэнтры БДУ.***

Гэта кніга – вынік шматлікіх даследаванняў, праведзеных за апошнія некалькі гадоў супрацоўнікамі кафедры, а таксама іншых падраздзяленняў і органаў дзяржаўнага кіравання, у тым ліку міністэрстваў і ведамстваў.

Сярод аўтараў, якія прысутнічалі на прэзентацыі, – загадчык кафедры міжнароднага турызму БДУ Леанід Гайдукевіч, прафесар Святлана Хоміч, старшы выкладчык Вольга Мазгавая, загадчык кафедры кіравання турызмам БДЭУ Аляксандр Тарасёнак, кіраўнік Беларускага грамадскага аб'яднання "Адпачынак у вёсцы" Валерыя Кліцунова, кіраўнік вядучага ў Беларусі інфармацыйнага турыстычнага партала Holiday.by Андрэй Барашка і інш.

Дэкан факультэта міжнародных адносін Віктар Шадурскі адзначыў вялікі ўнёсак у выданне кнігі супрацоўнікаў упраўлення рэдакцыйна-выдавецкай работы.

Манаграфія зміяшчае аналіз замежнага досведу і стану развіцця экалагічнага турызму ў нашай краіне, стратэгію ўстойлівага развіцця экатурызму ў Беларусі, а таксама мадэль арганізацыі і кіравання сістэмай экатурызму ў праекце Нацыянальнага парку "Белая Русь".

Практычную цікавасць уяўляе распрацаваная аўтарамі манаграфіі стратэгічная праграма дзеянняў па развіцці формаў і відаў экатурызму на мясцовым, рэгіянальным і нацыянальным узроўнях.

Манаграфія адрасавана міністэрствам і ведамствам, якія рэгламентуюць развіццё турызму і выкарыстанне прыродных рэсурсаў, а таксама праектным арганізацыям. Выданне апрабавана ў якасці вучэбнага дапаможніка ў рамках спецкурса "Экалагічны менеджмент у турызме".

**Дзмітрый ЖАРЫН**
**Фота Мікіты БЯЗРУКАВА**

## Даведка

Кафедра міжнароднага турызму факультэта міжнародных адносін БДУ была заснавана 5 кастрычніка 1998 г. Сёння на пяці курсах аддзялення, у магістратуры і аспірантуры навучаецца каля 300 чалавек. За гэты перыяд было абаронена 1 доктарская, 2 кандыдацкія і 6 магістэрскіх дысертацый, у тым ліку ступень магістра атрымалі 4 навучэнцы з КНР.

Супрацоўнікі кафедры займаюцца навуковымі даследаваннямі ў межах школы "канструктыўнага турызму". Па замове Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі і Глабальнага Фонду ААН на кафедры распрацавалі Стратэгію развіцця экатурызму ў нашай краіне, а таксама вядуць распрацоўку праекта развіцця экатурызму ў басейне ракі Прыпяць. Кафедра актыўна ўдзельнічала ў распрацоўцы Нацыянальных праграм развіцця турызму на 2001–2005, 2006–2010 гг.

НЕ ПРАМІНІЦЕ!

# СТУДЭНЦКІ ЗБОРНІК

***У маі 2008 года паводле ініцыятывы навуковага студэнцкага савета факультэта міжнародных адносін быў выпушчаны першы зборнік навуковых артыкулаў (публікацыі лічацца удзелам у НДРС, маюць значэнне пры памяншэнні аплаты студэнтам платнай формы навучання), які даў магчымасць студэнтам, магістрантам і аспірантам публікаваць вынікі сваёй навуковай дзейнасці. Усялякую падтрымку гэтаму пачыну аказала кіраўніцтва ФМА.***

Тэматыка артыкулаў у большасці адпавядала спецыяльнасцям факультэта: "Міжнародныя адносіны", "Міжнародны турызм", "Сусветная эканоміка", "Міжнароднае права", "Мытная справа", "Культуралогія", "Лінгвакраіназнаўства". У зборніку былі таксама апублікаваны артыкулы калег з БДЭУ і Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце РБ. Надалей мяркуецца пашырэнне колькасці тэматык у адпаведнасці з запатрабаванасцю.

Выданне другога выпуску плануецца 15 снежня 2008 г. (па меры назапашвання матэрыялаў).

Дадатковую інфармацыю можна атрымаць на сайце http://nirs.do.am/

*Нашы кантакты:*
тэл. +375 29 765 24 50 (намеснік старшыні навуковага студэнцкага савета ФМА Сяргей Анцух).

Дасылайце свае запытанні таксама на e-mail: nirs@tut.by

Запрашаем да супрацоўніцтва ўсіх зацікаўленых асобаў і арганізацый!



# ІНТЭЛІГЕНТНАСЦЬ – АД ПРЫРОДЫ

***Біялогія сёння лічыцца навукай XXI стагоддзя. Нездарма пры паступленні на адпаведны факультэт БДУ апошнім часам назіраецца самы высокі конкурс. Патрапіўшы ж на біяфак, юнакі і дзяўчаты яшчэ больш упэўніваюцца, што зрабілі правільны выбар. Асабліва схіляе іх да вучобы заўсёдная ўсмешка дэкана Уладзіміра Лысака. Ён, як і ўсе тамтэйшыя выкладчыкі, з вялікай любоўю ставіцца да жывёл, раслін і наогул усяго жывога. Можа аднолькава захоплена гаварыць як пра бактэрыі, даследаваннем якіх займаецца многія гады, так і пра сваіх студэнтаў. Да яго можна свабодна зайсці ў кабінет і атрымаць параду. Мы пагутарылі з гэтым неардынарным чалавекам. Тым больш, што нядаўна Уладзімір Васільевіч адсвяткаваў 60-годдзе.***


Уладзімір Лысак

*– Быць дэканам – адказная справа, бо ад яго ў першую чаргу залежыць арганізацыя вучэбнага і навуковага працэсу...*

– Нялёгка, бо наш факультэт патрабуе складанай матэрыяльнай базы. На факультэтах гуманітарнага і некаторых факультэтах прыродазнаўчага профілю для работы хапае камп'ютараў і дошак. У нас жа патрэбна думаць пра догляд эксперыментальных жывёл, утрыманне ўласнага ўчастка, а таксама падтрымліваць свой вучэбна-навуковы цэнтр – Нарачанскую біялагічную станцыю імя Г. Г. Вінберга.

А калі ўлічыць, што на факультэце развіваюцца самыя розныя кірункі біялагічнай навукі, а гэта біятэхналогія, генетыка, заалогія, батаніка, мікрабіялогія, экалогія, фізіялогія чалавека і жывёл, фізіялогія раслін, то становіцца зразумелым, чаму арганізацыя вучэбнага і навуковага працэсу патрабуе немалых фінансавых выдаткаў на хімічныя рэактывы і абсталяванне. Бо кожны такі кірунак прадугледжвае выкарыстанне ўласных методык і інструментарыя.

Многім здаецца, што біялогія – гэта мікраскоп (у найлепшым выпадку), і ўсё.

На сёння біялогія – навука, якая выкарыстоўвае для свайго развіцця ўсе прыродазнаўчыя дысцыпліны. Наш вучэбны план пабудаваны такім чынам, што студэнты паглыблена вывучаюць хімію: неарганічную, арганічную, аналітычную, фізічную, калоідную, біяхімію, а таксама праходзяць фізіку, вышэйшую матэматыку, інфарматыку. Гэта робіцца для таго, каб у сваіх даследаваннях біялагічных аб'ектаў яны выкарыстоўвалі самыя сучасныя метады.

Я пастаянна кажу выкладчыкам, што мы не павінны скаціцца на той узровень, каб паказваць эксперыменты на лабараторных занятках на пальцах і маляваць крэйдай на дошцы. Мы павінны навучыць студэнтаў працаваць з лабараторным посудам, з абсталяваннем, каб потым не было няёмка за вядучую ВНУ краіны.

У нас 9 кафедраў, 7 навукова-даследчых лабараторый, дзе нашы студэнты пад кіраўніцтвам навуковых супрацоўнікаў і выкладчыкаў выконваюць курсавыя і дыпломныя работы, займаюцца навукай.

*– На біялагічным факультэце прайшло амаль усё Ваша свядомае жыццё, ды і на пасадзе дэкана Вы ўжо 12 гадоў. Што змянілася ў апошні час?*

– За гэтыя гады факультэт павялічыўся ў колькасных адносінах. Апошнім часам у нас самы вялікі конкурс пры паступленні сярод прыродазнаўчых факультэтаў, і на дзённае, і на завочнае аддзяленні. Калі раней было толькі некалькі студэнтаў, якія вучыліся на платнай аснове, то сёння ў нас "платнікаў" нават болей, чым "бюджэтнікаў". З павелічэннем колькасці студэнтаў у нас узрасла і колькасць выкладчыкаў. Нават новы будынак біялагічнага факультэта, якога мы чакалі цэлых 15 гадоў, стаў здавацца цесным. Справа ў тым, што ў нас амаль усе заняткі лабараторныя. І мы кожную групу дзелім на падгрупы. Такім чынам, на кожным курсе атрымліваецца 10 груп, 20 падгруп, а па ўсім факультэце ўжо недзе 100 падгруп. Таму студэнты вучацца ў дзве змены.

За гэтыя гады была арганізавана новая кафедра малекулярнай біялогіі. Гэта сучасная кафедра, якая займаецца самымі перадавымі кірункамі біялагічнай навукі. Вучоныя тут імкнуцца высветліць, якія працэсы адбываюцца ў клетцы жывога арганізма на малекулярным і генным узроўнях, што даволі складана. Да таго ж, узніклі дзве лабараторыі: прыкладных праблем біяхіміі і фізіялогіі раслінnай клеткі.

За апошнія гады пабудаваўся новы корпус вучэбна-навуковага цэнтра "Нарачанская біялагічная навуковая станцыя імя Г. Г. Вінберга". Яго кіраўніком з'яўляецца доктар біялагічных навук Таццяна Жукава. На базе станцыі праводзяць навуковыя даследаванні супрацоўнікі ўсіх кафедраў, а таксама студэнты, якія спецыялізуюцца па экалогіі, батаніцы і заалогіі.

На сёння мы валодаем самым буйным у нашай рэспубліцы заалагічным музеем, які таксама выконвае адукацыйныя функцыі і дапамагае нам у прафарыентацыйнай рабоце. Каб паглядзець на яго экспанаты, якія ўвесь час папаўняюць нашы выкладчыкі і студэнты, прыязджаюць вучні з усіх школ нашай краіны. У сераду і чацвер экскурсійныя аўтобусы стаяць ля факультэта з самага ранку да позняга вечара.

Яшчэ адзін наш гонар – невялікая аранжарэя трапічных і субтрапічных раслін. Маем уласны невялічкі батанічны сад з экзатычнымі раслінамі. Дарэчы, мы з'яўляемся гаспадарамі самага буйнога ў Беларусі гербарыя. Ёсць і віварый для жывёл, так званая эксперыментальная клініка, у якой утрымліваюцца мышкі, пацукі, трусы, патрэбныя для навуковых даследаванняў.

Натуральна, што наш факультэт, як і ўвесь універсітэт, за гэты час значна ўдасканаліў арганізацыю вучэбнага працэсу. Зараз надаецца вялікая ўвага новым адукацыйным тэхналогіям, укараняюцца інфармацыйныя тэхналогіі. Па ўсіх курсах на адукацыйнай платформе "e-University" на серверы БДУ і факультэта размяшчаюцца вучэбныя матэрыялы, анатацыі, праграмы, неабходная літаратура, тэсты, з дапамогай якіх студэнты могуць праверыць свае веды. Акрамя гэтага, выдадзена шмат вучэбных дапаможнікаў для студэнтаў, многія з іх з грыфам Міністэрства адукацыі. Распрацаваны новыя тыпавыя вучэбныя планы і праграмы.

*– Што значаць для Вас як выкладчыка студэнты, студэнцкае жыццё?*

– Я выкладаю агульны курс мікрабіялогіі і на дзённым, і на завочным аддзяленнях, а таксама два спецкурсы. Я павінен дыхаць навукай, дыхаць адукацыйным працэсам. Мне гэта дапамагае разумець студэнтаў. Калі я пачынаю чытаць свой прадмет на трэцім курсе, я ўжо многіх студэнтаў называю па прозвішчы і імені. Іх здзіўленню няма канца: маўляў, адкуль я іх памятаю. Я заўсёды адказваю, што гэта мая праца, я павінен іх ведаць, павінен цікавіцца, чым яны займаюцца не толькі ў вучэбны час, але і ў вольны. Ужо на першым арганізацыйным сходзе я кажу, што нам варта паважаць адзін аднаго і пры сустрэчы займець за правіла ўсміхацца. І тлумачу: "Нават калі я вас не пазнаю ў горадзе, і вы мне ўсміхняцеся, я адразу зразумею, што гэта біёлаг, мой студэнт, мой выпускнік". І яны заўсёды мне ў адказ усміхаюцца, асабліва першакурснікі. Колькі б клопатаў у мяне ні было, я таксама стараюся людзям усміхацца. Бо лічу гэта за прывітанне, дэманстрацыю сваіх добрых адносінаў да чалавека.

У нас найлепшыя студэнты. Яны ганарацца, што навучаюцца на біялагічным факультэце, і гэта іх адрознівае ад іншых. Накладвае адбітак сама навука, якая звязана з жыццём, з зямлёй. Калі любіш прыроду, то будзеш з любоўю ставіцца і да ўсяго астатняга. Нашы студэнты больш інтэлігентныя, культурныя, выхаваныя. Гэта заўважаюць і выкладчыкі з іншых факультэтаў, якія чытаюць у нас лекцыі.

*– Якім Вы бачыце свой факультэт у найбліжэйшыя гады?*

– Патрэбна ўвесь час удасканальваць абсталяванне, якое зробіць навуковыя даследаванні больш дакладнымі і абгрунтаванымі. Новыя спецыяльнасці, мяркую, уводзіць не варта. Пашыраць вучэбны працэс патрэбна за кошт увядзення дадатковых, больш вузкіх, спецыялізацый. І рыхтаваць неабходна пачаць ужо для канкрэтных арганізацый і прадпрыемстваў. Зразумела, што нябблага было б заключаць доўгатэрміновыя дамовы на падрыхтоўку пэўных спецыялістаў. Тым больш, што нашы выпускнікі на сёння запатрабаваны паўсюль.

**Ганна ЛАГУН**
**Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА**

# ШЫРОКІ СЭНС КУЛЬТУРЫ

***Нядаўна прафесару кафедры сацыялогіі ФФСН Паўле Украінец споўнілася 75 год. Дата досыць сталая, але толькі не для Паўлы Пятроўны. Яна мае поўную выкладчыцкую занятасць, піша кнігі, а таксама наведвае многія культурныя мерапрыемствы... За свой жыццёвы шлях Паўла Пятроўна працавала у камсамоле, раённых і абласных газетах, а таксама ў ЦК КПБ. Зараз яна выкладае студэнтам дысцыпліну "Сацыяльнае кіраванне". Таленавіты настаўнік і абаяльная жанчына, яна падзялілася з намі сваімі назіраннямі пра час, людзей і культуру.***


Паўла Украінец дзеліцца сваім жыццёвым роздумам

"Калі абагульніць усе цікавыя для мяне кірункі, то можна сказаць – гэта культура ў шырокім сэнсе: людзі, грамадскія адносіны, культура кіравання, мастацтва," – сцвярджае наша суразмоўца.

Пасля заканчэння журфака БДУ і Мінскай вышэйшай партыйнай школы, куды яна прыйшла з абласной газеты, Паўла Украінец была накіравана ў Пінск, дзе была абрана сакратаром гаркама партыі. Там занялася арганізацыяй культурных мерапрыемстваў: свята мастацтваў "Зоры над Пінай", тыдзень літаратурнай творчасці, святы "А ў нас у двары" і інш. Паўла Пятроўна ўзгадвае, што менавіта на днях паэзіі маленькай зоркай заблішчала Жэня Янішчыц, якую яна лічыць найвыдатнейшай лірычна-патрыятычнай паэткай нашага часу. Затым Паўла Украінец паступіла ў Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС (г. Масква), там жа абараніла кандыдацкую дысертацыю па філасофіі. Амаль 16 год прапрацавала ў ЦК КПБ.

– Я ганаруся шэрагам акцый, у якіх мне даводзілася прымаць актыўны ўдзел і нават іх ініцыіраваць. Гэта работа па фарміраванні матэрыяльных і духоўных каштоўнасцяў насельніцтва, стварэнне і дзейнасць сацыяльна-культурных і спартыўных комплексаў у гарадах, якія распаўсюджвалі свой выхаваўчы ўплыў і на навакольныя вёскі. Мы клапаціліся пра тое, каб і там пачулі цікавую лекцыю, пабачылі на свае вочы вядомых і таленавітых асоб. Акрамя пэўных акцый, ладзіліся шырокамаштабныя даследаванні сярод насельніцтва Гомельскай вобласці, дзеля паляпшэння ўмоў іх жыцця.

З цеплынёй П. Украінец успамінае і сваю першую вышэйшую адукацыю – журналістыку, выкладчыкаў, сяброў-студэнтаў. БДУ – гэта яе альма-матэр, якая стала і месцам працы, з якой звязаны самыя прыемныя ўспаміны пра аднадумцаў і ўдзячных выхаванцаў.

– Справа ў тым, што ў мяне добра атрымлівалася сумяшчаць практычную работу і яе тэарэтычнае абагульненне. Кнігу "Сацыяльна-культурны комплекс: вопыт, праблемы" можна лічыць выкарыстаннем журналісцкага патэнцыялу. Мой грэх перад журналістыкай толькі ў тым, што па волі лёсу я не ўсю дарогу вандравала па журналісцкіх сцежках. Затое зведала іншыя прафесіі.

Самым жа галоўным набыткам Паўла Пятроўна лічыць знаёмствы з выбітнымі людзьмі, з якімі лёс падараваў ёй сустрэцца. Гэта народны артыст СССР і БССР Яўген Глебаў, патрыярх беларускай музыкі Анатоль Багатыроў, выдатная оперная спявачка С. Данілюк, зоркі тэатральнай сцэны А. Клімава, М. Захарэвіч, Н. Гайда, літаратары С. Законнікаў, Я. Янішчыц, У. Ліпскі, скульптар А. Анікейчык і многія іншыя. Яны непасрэдна паўплывалі на яе кругагляд, узровень адукаванасці і культуры.

– Я вяла ў ЦК партыі творчыя саюзы, культурна-асветніцкую працу. Мне вельмі пашчасціла апынуцца ў асяродку такіх людзей, якія складаюць гонар рэспублікі, яны – людзі сусветнага маштабу.

Зараз яна нясе скарбонку свайго жыццёвага і прафесійнага вопыту студэнтам, да якіх спяшаецца ледзь не кожны дзень. Нават дзіўна, колькі ў яе яшчэ засталося імпэту...

– Як я спраўляюся – запытаецеся ў студэнтаў, – пасміхаецца. – Лічу, што выкладанне майго прадмета павінна мець і добрую тэарэтычную базу, і практычную накіраванасць. Я мушу ўсебакова падрыхтаваць студэнта. Таму даю шэраг практычных задач, тэстаў, ладжу ролевыя гульні, вучэбныя трэнінгі і інш.

Паўла Пятроўна ўвесь час прыдумляе штосьці новае.

***Даведка:***

**Украінец Паўла Пятроўна нарадзілася ў вёсцы Харомск Столінскага раёна Брэсцкай вобласці. Скончыла Пінскае педагагічнае вучылішча, факультэт журналістыкі БДУ, Мінскую вышэйшую партыйную школу, Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС. Кандыдат філасофскіх навук, доктар гістарычных навук, прафесар БДУ. Аўтар шэрага кніг па праблемах кіравання, паліталогіі, сацыяльнай і культурна-асветніцкай працы.**

**Кацярына РАМАНАВА**
**Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА**

МАНІТОРЫНГ

# Разам будуем студэнцкае жыццё



***Падчас мерапрыемства "Vivat, student!" актывісты БРСМ правялі анкетаванне сярод 46 студэнтаў I курса.***

Па-першае, на мэце было вызначыць адносіны студэнтаў да БРСМ. Прыемна, што 73,9 % (34 чалавекі) адносяцца да арганізацыі станоўча. Толькі 3 выказалі адмоўную пазіцыю, а 9 чалавек (19,6 %) заявілі пра сваю абыякавасць. Што ж, спадзяёмся, што ў хуткім часе яны зменяцца на пазітыўныя.

Пасля мы вырашылі даведацца, ці валодаюць студэнты агульнай інфармацыяй пра згаданую грамадскую арганізацыю.

Правільна расшыфравалі абрэвіятуру БРСМ (Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі) амаль усе апытаныя – 45 чалавек. БРСМ з'яўляецца пераемнікам традыцый камсамольскай арганізацыі (правільна адказалі 32 чалавекі з 46), а не піянерскай і не прафсаюзнай арганізацый. Членам арганізацыі можна быць да 31 года. Менавіта да гэтага ўзросту ў нашай краіне чалавек лічыцца маладым. І нарэшце, галоўнай асобай з'яўляецца сакратар. Кіраўнік БРСМ БДУ – Дзмітрый Мікулка, а начальнік рэспубліканскай арганізацыі – Юрый Крывадубскі.

Далей ішлі самыя цікавыя пытанні, бо на іх не было падказак. На пытанне "Што Вам падабаецца ў арганізацыі?" 13 чалавек адказалі "усё". Культурна-масавыя мерапрыемствы назвалі 5 чалавек, канцэрты і дабрачынныя акцыі – 3 чалавекі, 1 чалавек назваў суботнікі. Некаму падабаецца еднасць моладзі, магчымасць праявіць свае здольнасці і карысна арганізаваць свой вольны час. Дзякуем за давер і за такія адносіны. Аднак 17-ці чалавекам (36,9 %) было цяжка адказаць на гэтае пытанне. Што ж, студэнты, чакаем вас з прапановамі па арганізацыі вольнага часу і абяцаем дапамагчы рэалізаваць свае здольнасці!

Таксама 17 чалавек не змаглі даць канкрэтны адказ на запытанне "Што не падабаецца ў дзейнасці арганізацыі?", а 20 чалавек – усё задавальняе. Для нас гэта добры паказальнік. Яшчэ па адным чалавеку (2,2 %) адказалі, што ім не падабаюцца: дабраахвотна-прымусовы запіс у арганізацыю, бюракратызм, узроставы цэнз, адсутнасць наладжанай сістэмы, членскія ўнёскі. Нарэшце, незадавальненне выклікае факт, што пра арганізацыю ведаюць толькі тыя, хто ёю цікавіцца...

Пра дабраахвотна-прымусовы запіс мы, канечне, чулі. Але пагадзіцеся, вы ўжо дарослыя людзі і самі выбіраеце, у якім накірунку ісці. Ніхто не можа прымусіць вас паставіць уласны подпіс. Сёння наша арганізацыя дзейнічае паводле прынцыпу "лепей менш – ды лепшых". Бюракратызм? Адсутнасць наладжанай сістэмы? Паперкі – яны будуць заўсёды, без іх нікуды. Але ці можна назваць запаўненне заявы ці анкеты бюракратызмам? Наўрад ці. Сістэма ж з кожным годам наладжваецца. Прыводзяцца ў парадак картатэкі, дакументацыя. Пра ўзрост мы ўжо казалі. Вам жа яшчэ вельмі далёка да 31 года. Весяліцеся, жывіце студэнцкім актыўным жыццём. Калі ж дужа пажадаеце, то і пасля 30-ці вы можаце быць добрым сябрам арганізацыі. Без членскіх унёскаў нельга. З неба ж грошы для арганізацыі не зваляцца! Ёй трэба на нешта існаваць – гэта сістэма ўсеагульная. Тым болей, што ўнесці трэба ўсяго 1 тысячу рублёў раз у семестр. Зразумела, асноўную інфармацыю аб арганізацыі ведаюць яе актывісты – тыя, хто гэтым цікавіцца. Заходзьце, і вам таксама пра ўсё распавядуць. Да таго ж, у БДУ працуе Студэнцкі інфармацыйны цэнтр БРСМ. Ён выдае ўласную газету "Новый стиль". У ёй вы можаце даведацца не толькі пра дзейнасць арганізацыі, але і пра шматлікія універсітэцкія мерапрыемствы.

Дзякуй за вашыя парады наконт удаканалення дзейнасці арганізацыі. Мы будзем і далей паляпшаць агітацыю і ўважліва прыслухоўвацца да моладзі, да яе патрэб. Вы жадаеце яшчэ больш мерапрыемстваў? Далучайцеся. Іх сапраўды нямала. А вось наогул пазбавіцца ад ідэалагічных момантаў не атрымаецца. Мы ж з вамі грамадзяне краіны і не можам заставацца па-за тым, што адбываецца ў ёй.

Вельмі ўдзячныя за вашы пажаданні поспехаў, больш пазітыву, аптымізму, масавасці. Нам сапраўды было вельмі важна пачуць вашыя меркаванні. Удачы і вам у гэтым годзе! Давайце разам рабіць студэнцкае жыццё яскравым і годным!

**Дар'я ПРЫШЧЭПАВА**

## ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

Студэнты фізічнага факультэта 18 верасня мелі унікальную магчымасць сустрэцца са знакамітым выпускніком нашага універсітэта, выбітным навукоўцам-фізікам, генеральным канструктарам ядзерных узбраенняў СССР, Героем Сацыялістычнай працы Аркадзем Брышам.

Сустрэча вельмі зацікавіла моладзь. Задавалася шмат пытанняў аб праблеме гонкі ўзбраенняў падчас "халоднай вайны", пра гісторыю стварэння ядзернай зброі, умовы працы спецыялістаў-фізікаў у той перыяд. Дарэчы, 91-гадовы ветэран дагэтуль трымаецца ў выдатнай форме і з'яўляецца ганаровым навуковым кіраўніком ВНДІ аўтаматыкі імя М.Духава (уваходзіць у сістэму Федэральнага агенцтва па атамнай энергіі), дзе працаваў з 1964 па 1997 гг.

Пагутарыў з легендарнай асобай і рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў.

***

Вучэбную літаратуру па рускай мове, літаратуры і культуры перадаў 24 верасня Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Расіі Аляксандр Сурыкаў філалагічнаму факультэту БДУ і Беларускаму грамадскаму аб'яднанню выкладчыкаў рускай мовы і літаратуры.

У мерапрыемстве бралі ўдзел рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў, дэкан факультэта Іван Роўда, выкладчыкі і студэнты. Затым кіраўнік расійскай дыпламатычнай місіі і кіраўніцтва БДУ абмеркавалі магчымасці далейшага супрацоўніцтва на ніве выкладання рускай мовы і літаратуры студэнтам нашага універсітэта, у тым ліку і замежным грамадзянам.

# МЕТОДЫКА – І КЛОПАТ І НАТХНЕННЕ

***Напярэдадні Дня настаўніка на філалагічным факультэце адбылася сустрэча выкладчыкаў і студэнтаў з выпускнікамі, частка якіх спецыялізавалася па кафедры рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры.***



*Супрацоўнікі і выпускнікі кафедры падчас сустрэчы*

На гэта мерапрыемства былі запрошаны не толькі маладыя настаўнікі, што "сеюць разумнае, добрае, вечнае", але і іншыя былыя студэнты, у жыцці якіх методыка адыграла значную ролю. Усіх прысутных вітала загадчык названай кафедры Ірына Таяноўская. Першым узяў слова Фёдар Драбеня, кандыдат філалагічных навук, выкладчык беларускай мовы і літаратуры політэхнічнай гімназіі № 6, удзельнік конкурсу "Настаўнік года-2008" – чалавек, які здзіўляе сваім педагагічным майстэрствам, імкненнем да творчага пошуку і невычарпальнай энергіяй. Фёдар Драбеня прызнаўся, што як студэнт без вялікай ахвоты наведваў заняткі па методыцы, пакуль падчас педагагічнай практыкі не сутыкнуўся з праблемай: як выкладаць, каб цябе ўважліва слухалі і разумелі? Менавіта методыка дапамагае цікава сканструяваць змест адукацыйнага працэсу, падабраць матэрыял, знайсці займальныя метады навучання для кожнага вучня.

Вольга Мацюк, настаўніца беларускай мовы і літаратуры гімназіі № 16, заўважыла: "Школьны ўрок, нібыта жыццё – калі не раскрыеш перад вучнямі мэту ўрока і не ахарактарызуеш тыя моўныя і маўленчыя ўменні, якімі належыць авалодаць у працэсе занятку, то ўрок, як і жыццё, атрымліваецца бессэнсоўным".

Творча і натхнёна выкладае беларускую літаратуру ў Інстытуце журналістыкі БДУ Аксана Бязлепкіна, кандыдат філалагічных навук. Яна цудоўна валодае беларускім словам, праз яго перадае замежным студэнтам любоў да нашай краіны. Праца ў інстытуце стала неад'емнай часткай яе жыцця. Аксана Бязлепкіна кажа, што "прафесія выкладчыка – гэта не проста прафесія, гэта лёс, гэта сапраўднае прызнанне сеяць зярняты ведаў, дапамагаць выхаванцам знаходзіць свой шлях у жыцці".

Падзяліліся сваімі прафесійнымі дасягненнямі Алеся Літвінава, якая працуе выкладчыкам рыторыкі на АНТ. Алеся, дзякуючы заняткам па рыторыцы і методыцы, упэўнена выступае перад аўдыторыяй, выключна валодае голасам, па-майстэрску ўмее весці дзелавую гутарку.

Семінарыстка дацэнта Вольгі Праскаловіч Марыя Табола з вялікім захапленнем расказвала пра свой першы ўдала праведзены ўрок па беларускай літаратуры. Марыя вучыцца на V курсе і плануе звязаць сваё жыццё з настаўніцкай дзейнасцю.

Вікторыя Шумчык прызналася, што наведвала спачатку паўтара гады семінар па гісторыі беларускай мовы. Тым не менш, яна спынілася на метадычным семінары пад кіраўніцтвам дацэнта кафедры і арганізатара сустрэчы Ірыны Саматы і абрала найлепшую ў свеце прафесію – прафесію настаўніка. Зараз Вікторыя вучыцца ў магістратуры педагагічнага профілю. "Іншым разам на твой лёс так не паўплываюць бацькі, як гэта зробіць выкладчык. Вялікае шчасце, калі такі педагог, як Ірына Мікалаеўна, сустрэнецца на жыццёвым шляху", – шчыра сказала Вікторыя. Вольга Мягчыла, таксама семінарыстка І. Саматы, з'яўляецца аспіранткай Нацыянальнага інстытута адукацыі.

Удзельнікі сустрэчы згадзіліся, што методыка прапаноўвае мноства "рэцэптаў". Але перш за ўсё неабходна атрымліваць радасць і задавальненне ад працы, з павагай ставіцца да дзяцей, якія абавязкова адкажуць разуменнем і шчырай любоўю.

**Марына ГРЫНЕВІЧ**

НАВУКА

# УШАНАВАННЕ НАВУКОЎЦАЎ

***Паводле рашэння Вучонага савета БДУ ад 6 кастрычніка 2008 г. былі названы лаўрэаты прэмій У. Пічэты і А. Севчанкі.***

Прэмія імя У. Пічэты ў галіне сацыяльных і гуманітарных навук прысуджана **Уладзіміру Снапкоўскаму**, прафесару кафедры міжнародных адносін ФМА, доктару гістарычных навук *за цыкл вучэбных і навуковых прац па гісторыі знешняй палітыкі Беларусі* з уручэннем дыплома і грашовай узнагароды ў памеры 2 112 тыс. руб.

На гэты раз прэмію імя А. Севчанкі ў галіне прыродазнаўчых і тэхнічных навук вырашана даць двум аўтарскім калектывам:

1) **Наталлі Лапчук**, дацэнту кафедры фізікі паўправаднікоў і нанаэлектронікі, кандыдату фізіка-матэматычных навук (фізфак); прафесару **Уладзіміру Аджаеву**, загадчыку кафедры фізікі паўправаднікоў і нанаэлектронікі, доктару фізіка-матэматычных навук (фізфак); **Мікалаю Паклонскаму**, прафесару кафедры фізікі паўправаднікоў і нанаэлектронікі, доктару фізіка-матэматычных навук (фізфак); **Дзмітрыю Свірыдаву**, прафесару кафедры неарганічнай хіміі, доктару хімічных навук (хімфак) – з уручэннем дыплома і грашовай узнагароды ў памеры 528 тыс. руб. за цыкл прац *"Структураваныя вугляродныя матэрыялы: кластары, нанатрубкі, іёна-імплантаваныя палімеры і алмазы"*.

2) прафесару **Міхаілу Жураўкову**, дэкану механіка-матэматычнага факультэта, доктару фізіка-матэматычных навук; **Міхаілу Мартыненку**, прафесару кафедры тэарэтычнай і прыкладной механікі, доктару фізіка-матэматычных навук (мехмат); **Алегу Канавалаву**, старшаму навуковаму супрацоўніку матэматычнага забеспячэння АСУ (ФПМІ); **Васілю Відзякіну**, дацэнту кафедры тэарэтычнай і прыкладной механікі, кандыдату фізіка-матэматычных навук (мехмат); **Анатолю Кляўчэню**, загадчыку НДЛ прыкладной механікі, кандыдату фізіка-матэматычных навук (мехмат) – з уручэннем дыплома і грашовай узнагароды ў памеры 423 тыс. руб. за цыкл прац *"Механіка-матэматычнае і праграмнае забеспячэнне карпаратыўных аўтаматызаваных сістэм спалучанага геаманіторынгу для рэгіёнаў распрацоўкі месцазнаходжанняў карысных выкапняў і ўкараненне гэтых сістэм на рудніках РУП «ПА "Беларуськалій"» РБ і нафтаздабыўных прадпрыемствах РФ"*.

Дарэчы, у новым Палажэнні аб прысуджэнні прэмій, якое зараз распрацоўваецца, паводле прапановы рэктара БДУ прафесара Васіля Стражава, мяркуецца зрабіць гэты конкурс штогадовым.

**Паводле інфармацыі НДЧ–ГУН**

# БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

Вучоба ў БДУ і жыццё студэнткі з Кітая Лі Нін – **"Звязда"/"ЧЗ" (03.10).**

Уражанні ад моўнай практыкі ў КНР студэнткі філфака Кацярыны Лямешкі – **"Звязда"/"ЧЗ" (03.10).**

Праект "Мая школа", падрыхтаваны студэнткай мехмата БДУ Святланай Грыгеліс – **"Звязда"/"ЧЗ" (03.10).**

Удзел фізікаў БДУ ў стварэнні Міжнароднага лінейнага калайдэра – **"Народная газета" (01.10).**

Інтэрв'ю з дырэктарам Інстытута журналістыкі БДУ Сяргеем Дубовікам – **"Советская Белоруссия" (01.10).**

Узнагароды БДУ на XIV Міжнароднай выставе-кангрэсе "Высокія тэхналогіі. Інавацыі. Інвестыцыі" ў Санкт-Пецярбургу – **БелТА (30.09; 06.10); "Настаўніцкая газета" (07.10).**

30 гадоў архіпастырскага служэння на Беларусі ўладыкі Філарэта рэктара Інстытута тэалогіі БДУ – **БелаПАН (25.09); "Настаўніцкая газета" (27.09); "Вечерний Минск" (29.09).**

Падпісанне дагавора аб супрацоўніцтве паміж БДУ і сеткай міжнародных цэнтраў рэлятывісцкай астрафізікі (ICRANet) – **"Звязда"/"ЧЗ" (26.09).**

Міжнародны фестываль студэнцкіх тэатраў "Тэатральны куфар", арганізаваны БДУ – **БелТА (26.09; 06.10); БелаПАН (26.09); "Звязда"/"ЧЗ" (26.09; 07.10); "Вечерний Минск" (06.10).**

Свята ў гонар першакурснікаў Студгарадка БДУ – **"Вечерний Минск" (25.09).**

Пра студэнтаў БДУ – пераможцаў праекта "Мінская змена: Лідар-2008" – **"Вечерний Минск" (25.09).**

Конкурс эсэ на тэму "Сучасная Беларусь: ад мары да рэчаіснасці" – **БелТА (18.09); "Звязда" (24.09).**

Інтэрв'ю з прызёрам Алімпійскіх гульняў у Пекіне – студэнтам гістарычнага факультэта БДУ Міхаілам Сямёнавым – **"Народная газета" (18.09-24.09).**

Засяленне студэнтаў у інтэрнаты – **"Советская Белоруссия" (18.09); "Минский курьер" (25.09).**

Пра ФПМІ БДУ, уступныя выпрабаванні ў Ліцэй – **"Репетитор" №6.**

## У ВОЛЬНЫ ЧАС

# З РОГА ЎСЯГО МНОГА


*"Трамвай жаданняў–2008"*

***І зноў Мінск пачынае тэатральны сезон, прымаючы ў сябе моладзевыя калектывы са шматлікіх краін свету. З 6 па 11 кастрычніка ў нашым горадзе прайшоў юбілейны, пяты, фестываль студэнцкіх тэатраў "Тэатральны куфар", арганізаваны кіраўніцтвам па справах культуры Белдзяржуніверсітэта пры падтрымцы Міністэрства адукацыі Беларусі.***

Сёлета аднавілася перапыненая было традыцыя – ізноў па вуліцах горада праехаў "Трамвай жаданняў", які і стаў першай ластаўкай фестывалю. На прыпынках акцёры ў яркіх пярэстых уборах забаўлялі публіку невялікімі сцэнкамі. Упершыню было дазволена правядзенне ўрачыстага шэсця "Тэатр без межаў" – акцёрская брація з песнямі і скокамі прайшла праз цэнтр горада, ад Ліцэя БДУ да Палаца прафсаюзаў, дзе і адбыўся першы фестывальны паказ.

Дзевятнаццаць тэатральных калектываў з Беларусі, Расіі, Літвы, Эстоніі, Украіны, Сербіі, Нідэрландаў і Германіі прадставілі на фестывалі самыя разнастайныя па жанры, характары і настроі спектаклі – тут былі і пастаноўкі класікі, перароблены на арыгінальны манер ("Сірано" па п'есе Растана, "Чайка" па п'есе Чэхава), і спектаклі, створаныя маладымі драматургамі, авангардныя па сваім змесце ("Псіхоз 4,48" па п'есе С. Кейн). На дзвюх пляцоўках – у Ліцэі БДУ і ў Палацы прафсаюзаў – мінскія аматары тэатра маглі назіраць штодня па тры-пяць спектакляў, пастаўленых з фантазіяй, уласцівай маладосці, і з натхненнем, уласцівым бескарыслівым, апантаным сваёй справай людзям. Усяго за шэсць дзён фестывалю мінскі глядач убачыў дваццаць пастановак. Дарэчы, на гэты раз у праграмках была пазначана мова спектакляў, і цяпер наведвальнікі маглі выбіраць усвядомлена.

У рамках фестывалю праходзілі таксама мерапрыемствы, закліканыя арганізаваць абмен досведам паміж тэатральнымі калектывамі розных краін – традыцыйныя майстар-класы тэатральных рэжысёраў і педагогаў Лейфа Олсана са Швецыі, Орыела Зохара з Ізраіля і Кэралайн Хедлі з Вялікабрытаніі. З нагоды юбілею на фестываль былі запрошаны пераможцы мінулых гадоў – тэатр-студыя "Цэнтр" Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага універсітэта, народны моладзевы тэатр "Пілігрым" з Полацка, народны музычны тэатр "На філфаку" БДУ, тэатр "Сёмы паверх" Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў.

Па традыцыі на цырымоніі закрыцця фестывалю адбыўся паказ спектакля "Ген кахання" ў рамках праекта "Koufar-In-Motion". Гэты спектакль быў пастаўлены ўсяго за тыдзень Сяргеем Куліковым, акцёрам, рэжысёрам, лаўрэатам Эдынбургскага тэатральнага фестывалю. У стварэнні спектакля былі выкарыстаны эпізоды з п'есы Шэкспіра "Рамэо і Джульета", а таксама вытрымкі з дакументальных дэбатаў, якія праходзілі ў адным з інтэрнэт-чатаў.

Добра былі арганізаваны і адпачынак удзельнікаў фестывалю. Для іх адчыніў свае дзверы ўтульны гасцінічны комплекс "Ракета". За час фестывалю былі арганізаваны баль, прысвечаны пяцігоддзю "Куфра", вечар нацыянальных культур, калі кожны ўдзельнік фестывалю мог пакаштаваць экзатычныя стравы з іншых краін, а таксама вечарына, прысвечаная закрыццю мерапрыемства.

Ніводнае, нават самае лепшае, мерапрыемства не можа адбыцца зусім без праблем, і праблема сёлетняга, відавочна, узнікла з прычыны яго высокай якасці. Фестываль ужо мае ў Мінску пэўную вядомасць, і часам ахвотных паглядзець той або іншы спектакль было значна больш, чым магла змясціць адведзеная для гэтага глядзельная зала. Неаднаразова ў холах збіраліся натоўпы ахвотных убачыць паказ, вельмі расчараваныя немагчымасцю ажыццявіць гэта жаданне. Узровень фестывалю расце з кожным годам, гэтаксама як і колькасць цікаўных наведаць пастаноўкі, відавочна, што ў самым бліжэйшым будучым арганізатарам прыйдзецца задумацца пра рашэнне гэтай праблемы, "пахвальнай" для тэатральных калектываў.

У апошні дзень фестывалю стартаваў новы праект: «Бібліятэчка "Тэатральнага куфра БДУ"». Мэта гэтага праекта – распавесці пра тэндэнцыі ў сучаснай драматургіі, данесці да мас імёны маладых аўтараў-драматургаў або тых, хто раней ніколі не выдаваўся ў нашай краіне. У першы зборнік уключана пяць п'ес айчынных аўтараў на беларускай і англійскай мовах.


*Выступленне тэатра БДУ "На балконе"*

### ПЕРАМОЖЦЫ

Гран-пры фестывалю, які традыцыйна выдаецца на падставе галасавання гледачоў, сёлета дасталася студэнцкаму тэатру Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта за спектакль "Сірано". Гэтая пастаноўка – новы погляд на п'есу "Сірано дэ Бержэрак" Эдмона Растана – пастаўленая з вялікім талентам, сыграная з відавочным натхненнем, нікога не пакінула абыякавым. Нельга не адзначыць, што гэта адзіны спектакль, які ішоў у агульнай складанасці 130 хвілін. Арганізатары, якія ўсталявалі для спектакляў абмежаванне ў паўтары гадзіны, у дадзеным выпадку вырашылі праігнараваць гэтае правіла. "Сірано" быў пастаўлены на фестывальнай сцэне цалкам і прайшоў пры поўным аншлагу.

Тэатр МДУ быў прадстаўлены ў васьмі намінацыях – надзвычайны для фестывалю выпадак. За гэта дасягненне журы ўшанавала маскоўскую трупу спецыяльным прызам.

Пераможцам інтэрнэт-галасавання стаў драматычны тэатр БДУ "На філфаку" за спектакль "Вяртанне да пройдзенага". Прыз за лепшую жаночую ролю падзялілі паміж сабой Марыя Хадзінская з тэатра-студыі БДУКіМ "Сёмы паверх" і Святлана Латышава са студэнцкага тэатра БДУ "На балконе". Прыз за лепшую мужчынскую ролю дастаўся Раману Шарапінскаму з тэатра БДПУ "Жывое слова" за ролю смяротна хворага хлопчыка ў спектаклі "Апельсіны ў падарунак", пастаўленым па п'есе Э.-Э. Шміта "Оскар і Ружовая Дама". У намінацыях "Лепшая сцэнаграфія" і "Лепшае музычнае афармленне" таксама перамог гэты спектакль. Прыз за лепшую мужчынскую ролю другога плана атрымаў Канстанцін Гесь з БДУКіМ за спектакль "Чайка". Калектыў з Германіі "Event Produktion" атрымаў узнагароду за лепшы акцёрскі ансамбль, а таксама прыз за лепшую жаночую ролю другога плана (Марыяна Граф).

Лепшым рэжысёрам быў названы Калеў Куду з Тарту, які моцна ўразіў публіку спектаклем "Псіхоз 4.48". Спецыяльныя прэміі атрымалі: тэатр "На балконе" са спектаклем "Зацюканы апостал" – за ўклад у сучасны сусветны тэатральны працэс; тэатр "Das Dokumentartheater Berlin" са спектаклем "Балерына за калючым дротам" – за абарону правоў чалавека праз тэатральны працэс; тэатр "На балконе" са спектаклем "Жанчыны Бергмана" – за арыгінальнае інавацыйнае рашэнне.

Старшыня журы, прэзідэнт Міжнароднай асацыяцыі універсітэцкіх тэатраў, Жан-Марк Лару назваў гэты фестываль найлепшым з мноства бачаных ім арганізаваных. Уладзімір Макарэвіч, намеснік старшыні аргкамітэта фестывалю, начальнік упраўлення па справах культуры БДУ, заслужаны дзеяч культуры РБ, растлумачыў, што праца над наступным фестывалем пачнецца адразу ж пасля завяршэння гэтага. Аматары тэатра таксама адразу пачнуць чакаць наступнага фестывалю, які напэўна будзе яшчэ лепшы.

**Анастасія ШМІГЕЛЬСКАЯ**
**Кацярына РАМАНАВА**

## МАЙСТРОЎНЯ

# КУЛІНАРНЫЯ ЛАСУНКІ СТУДГАРАДКА

**Ці каштавалі вы калі-небудзь торт "Мара Віні-Пуха", або рыбу па-в'етнамску, або хаця б салат "Партызан у акопе"? Не? Значыць, вы вельмі многа страцілі, бо не былі на кулінарным паядынку, а менавіта так называюцца спаборніцтвы паміж аматарамі прыгатаваць штосьці смачненькае ў інтэрнатах. Такія спаборніцтвы праводзяцца ўжо трэці раз. Нягледзячы на адносна невялікія прызы за першае месца, гэты турнір дастаткова папулярны, і кухары стараліся як маглі. Няважна ж, што табе падораць за перамогу. Галоўнае – прызнанне таленту тваёй каманды.**

Гэты конкурс – ініцыятыва супрацоўнікаў Студэнцкага гарадка. Па словах дырэктара Міхаіла Чарапеннікава, гатуюць студэнты даволі нядрэнна, вось і было вырашана правесці такое спаборніцтва. Сапраўды, у кожным інтэрнаце можна знайсці чалавека, які хаця б раз спёк пірог ці прыгатаваў рагу з агародніны з рыбай або птушкай замест таго, каб зварыць пельмені, сасіскі з макаронамі або схадзіць паснедаць у найбліжэйшую кавярню. Відаць, працэс прыгатавання можа прываблíваць сам па сабе, бо, каб прыгатаваць страву, трэба не толькі ведаць рэцэптуру і некаторыя тэхнічныя тонкасці, але і ўмець яе прыгожа аформіць. А як прыемна спячы шарлотку на дзень нараджэння каханай дзяўчыны і ўявіць, як яна прачнецца ад пяшчотнага водару яблыкаў, запечаных у пірагу... Або правесці выхадныя ў кампаніі сяброў на скалістым беразе якога-небудзь мора з бакалам чырвонага паўсухога віна і малюскамі, пасмажанымі ў вогнішчы (папярэдне дастаўшы іх з глыбіні 4-5 метраў). Менавіта тут у чалавека праяўляецца натура "творцы", якую апявалі яшчэ дзеячы Адраджэння. У афармленні стравы надзвычай спатрэбіцца фантазія і ўяўленне студэнта, якія часам цяжка праявіць на семінарскіх занятках, напрыклад, па вышэйшай матэматыцы. Хаця, вядома, нікому з удзельнікаў спаборніцтва не трэба было плаваць па рэках па тую рыбу, якую падалі арганізатары конкурсу.

З задавальненнем адзначу, што з задачай "творцы, фантазёра і няўрымслівага рамантыка" каманды інтэрнатаў справіліся на "выдатна". Такой разнастайнасці страў, прыгатаваных, здавалася б, са звычайных і строга рэгламентаваных прадуктаў, я яшчэ не бачыў. Вельмі парадаваў салодкі плоў з разынкамі і чарнаслівам, мятны торцік, «З па 10 і "Крывавая Мэры"», пяшчотная рыбка з "чацвёркі", правільны мёд з "двойкі" і яшчэ шматшмат розных прысмакаў.

Перад вынясеннем рашэння журы старанна прадэгусціравала кожную страву. Выбар пераможцы залежаў ад усяго: і ад хатняга задання (торт, які трэба было прыгатаваць загадзя), і ад апетытнасці страў, і ад іх творчага афармлення, а таксама ад паказу саміх каманд. Дарэчы, тут варта адзначыць інтэрнацыянальную каманду інтэрната № 6, удзельніца якой парадавала ўсіх песняй на сваёй роднай, в'етнамскай, мове, а таксама каманду першага інтэрната, прадстаўніцы якога праспявалі песню на беларускай мове. Пасля здымання проб Міхаіл Барысавіч жартам прапанаваў правесці другі тур, на што многія "купіліся", бо дырэктар Студгарадка ўмее тонка пажартаваць не даўшы выгляду.

Першае месца было прысуджана камандзе чацвёртага інтэрната. Спецыяльным прызам ад кулінарнага партала *Вкус.by* была адзначана каманда інтэрната № 2, якая прыгатавала надзвычайны торцік з фігуркамі пчол і сотамі з мёдам.

У цэлым, конкурс удаўся на славу. Усе былі задаволеныя цудоўнай магчымасцю праявіць сябе ў адным з найвялікшых мастацтваў, вытокі якога ўзыходзяць да часоў з'яўлення чалавека на Зямлі. Бо не што іншае як кулінарнае майстэрства часам можа ператвараць размераную будзённасць у яркае запамінальнае свята. І менавіта ў гэтым мастацтве студэнты БДУ праявілі сябе як сапраўдныя знаўцы, хаця абсалютная большасць з іх не звяжа сваю будучую прафесію з кулінарыяй.

**Аляксей ЮРКЕВІЧ**

## УСМІХНЁМСЯ

Неяк амерыканскі фізік *Г. Марану* падчас сустрэчы ў сваёй лабараторыі з карэспандэнтам дужа хацеў уразіць гэтага не вельмі дасведчанага ў навуцы чалавека і з выхваленнем сказаў яму:

– Зараз я працую над канструкцыяй электроннага мікраскопа, які зможа павялічваць у два мільёны разоў!

Як жа здзівіўся фізік, калі замест радасных выгукаў і захаплення ён пачуў словы, якія зусім па-новаму асвятлілі яго працу:

– І трэба ж так! – ускліркнуў карэспандэнт. – Столькі намаганняў, энергіі і ведаў вы аддаяце на стварэнне прылады, якая звузіць поле вашага зроку ў два мільёны!

***

Выдатны нямецкі фізік *Вільгельм Конрад Рэнтген* атрымаў ліст з просьбай даслаць... некалькі рэнтгенаўскіх праменяў з інструкцыяй, як імі карыстацца. Высветлілася, што ў аўтара ліста ў грудной клетцы засела рэвальверная куля, а для паездкі да Рэнтгена ў яго не знайшлося часу. Рэнтген быў чалавекам з гумарам і адказаў на ліст так: "На жаль, цяпер у мяне няма ікс-праменяў, да таго ж перасылка іх – справа вельмі складаная. Лічу, што мы можам зрабіць прасцей: дашліце мне Вашу грудную клетку".

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

16 кастрычніка 2008 года
Падпісана да друку 17.10.2008 г.
Зак. 1102. Тыраж 2000 экз. Ум. друк. арк. 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, праспект. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Бабруйская, 7, п. 411, тэл. 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by